Бальшавіцкае прывітаньне лепшым барацьбітом за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 77 (3981)
ПЯТНІЦА, 20 САКАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Да зьезду барацьбы за суцэльную калектывізацыю

Трэці ўсебеларускі зьезд калгасаў, які адкрываецца сёньня, заклікан вырашаць пытаньні найвялікшай палітычнай важнасьці.

Зьезд падагуліць вынікі калгаснага будаўніцтва ў БССР і вызначыць далейшыя задачы барацьбы, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, за справу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, — суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва як класы.

Правыя апартуністы — гэтыя агенты шкоднікаў і простыя дапаможнікі сацыял-фашызму, выконваючы сацыяльны заказ кулацтва, патрацілі нямала сіл і энэргіі, каб затармазіць пераможны калгасны рух. На іх, гэтых здраднікаў рабочае клясы, ускладалі свае надзеі ўсе сілы міжнароднай контр-рэвалюцыі ад II меншавіцкага Інтэрнацыяналу да францускага імпэрыялізму і польскага фашызму, ад Каўцкіх і Абрамовічаў да беларускіх нацыянал-дэмакратаў — нацыянал-фашыстаў. На перамогу іх капітулянцкай кулацкай праграмы бралі стаўку Рамзіны і Громаны, Шэры і Кандрацьцевы, Суханавы і Ластоўскія ў сваёй контр-рэвалюцыйнай інтэрвэнцыянісцкай рабоце.

Сёньня ўвесь сьвет зьяўляецца сьведкай гістарычных перамог справы суцэльнай калектывізацыі ў краіне дыктатуры пралетарыяту. Гэтыя перамогі натхняюць рэвалюцыйным энтузіязмам міжнародны пралетарыят і выклікаюць дзікую нянавісьць сусьветнай буржуазіі. Гэтыя перамогі — вынік ленінскай палітыкі бальшавіцкай партыі, вынік яе непрымірымай барацьбы за сваю генэральную лінію супроць трацкізму, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, супроць «левага» апартунізму.

Пэрыяд ад 2-га да 3-га Ўсебеларускага зьезду калгасаў характарызуецца ўсё узрастаючым магутным разгортваньнем калгаснага руху.

Перавышаны і далёка пакінуты ззаду першапачатковыя намячэньні пяцігадовага пляну па калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Вырасьлі новыя тысячы калгасаў, новыя дзесяткі тысяч аднасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раз назаўсёды зруйнавалі межы сваіх індывідуальных палосак і аб'ядналіся ў калектывы.

Колькасьць калгасаў узрасла з 994 да 5.180. Да 3-га калгаснага зьезду замест 8.499 гаспадарак, у калгасах і камунах находзіцца 150.000!

Бальшавіцкі факт, факт, які ўшчэнт разьбівае ўсе кулацкія «тэорыйкі» правых і «левых» апартуністаў і наносіць сьмяротны ўдар па стаўцы контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў на сталынінскі хутар.

Пераможнае разгортваньне калектывізацыі ў корані зьмяняе суадносіны клясавых сіл на вёсцы і забясьпечвае абсалютную перавагу сацыялістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы на базе індустрыялізацыі.

Цяпер «лёс сельскай гаспадаркі і ня асноўных праблем будуць ад гэтага часу вызначаць не індывідуальныя сялянскія гаспадарні, а калгасы і саўгасы» (І. Сталін). Цяпер «калгасы — асноўная сіла ў вёсцы, апора савецкай улады» (Якаўлеў).

У адказ на контр-рэвалюцыйную здраднічую дзейнасьць меншавікоў-шкоднікаў новыя масы аднасобнікаў — беднякоў і сераднякоў уступілі ў калгасы. Расьце і пашыраецца сталінскі калгасны прыступ. ЗА 2 ДЭКАДЫ СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ (З 20 ЛЮТАГА ПА 10 САКАВІКА) У КАЛГАСЫ БССР УСТУПІЛА 9.550 НОВЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. За гэтыя 20 дзён арганізавана каля 400 новых калгасаў. Яні патрэбен іншы довад таго, што асноўныя масы аднасобнікаў, беднякоў і сераднякоў—за калгасы, за справу рабочае клясы супроць кулака—іх кроўнага ворага.

Народжаныя ў агні суровага змаганьня з кулаком, калгасы БССР, пад кіраўніцтвам партарганізацый, наперакор усялякім нічэмным прароцтвам правых і «левых» апартуністаў, ужо ў першым годзе свайго існаваньня на справе давялі аднасобным бядняцка-сераднякім масам усю нявымерна вялікую перавагу калектыўнай працы над працай індывідуальнай.

Посьпехі, якія дасягнуты намі ў справе калгаснага будаўніцтва, сапраўды вялізарныя. Але не на іх зьезд калгасаў павінен сканцэнтраваць сваю асноўную ўвагу. Барацьба за зьнішчэньне тых яшчэ даволі сур'ёзных недахопаў, якія ёсьць на сёнешні дзень у калгасным будаўніцтве, з тым, каб мабілізаваць масы калгасьнікаў на выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, з тым, каб па-бальшавіцку правесьці другую калгасную вясну і арганізаваць новы магутны ўздым калектывізацыі, — вось што павінна стаяць у цэнтры работ зьезду.

«Мы, — гаварыў тав. Якаўлеў у сваім дакладзе на VI усесаюзным зьездзе саветаў, — ня былі-б бальшавікамі, калі-б закрывалі вочы на спадасьці і недахопы калгасаў. Гэтых недахопаў яшчэ вельмі многа. Яны вынікаюць з нявопытнасьці нашых калгасьнікаў. 2.000 розных правіл, адзнак і звычаяў, якімі спакон вякоў кіраваўся селянін у сваёй рабоце, зараз пайшлі на нішто. Зараз патрэбны новыя правілы, бо ў наяўнасьці зусім іншыя працэсы вытворчасьці, па-іншаму расстаўляюцца сілы, па-новаму вядзецца ўлік таго, што ёсьць. Гэта стварае вялікую колькасьць памылак, усякага роду блытаніну і растрату працы. Сапраўдны вопыт работы ў калгасах яшчэ толькі ствараецца».

У цэлым радзе нашых калгасаў праца усё яшчэ не арганізавана так, як трэба, не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва, не наладжан дакладны і выразны ўлік. Не ва ўсіх калгасах праведзена правільнае разьмеркаваньне ўраджаю і даходу па колькасьці і якасьці працы. Ня ўсюды сустрэлі руйнуючы адпор спробы правых апартуністаў штурхнуць паасобныя калгасы на шлях кулацкага разьмеркаваньня ўраджаю па едаках. Хіба не дапамагае кулацтву той факт, што яшчэ і на сёньня 499 калгасаў зусім не разьмеркавалі свайго ўраджаю.

Тэмпы нарастаньня новага калгаснага прыліву, ня гледзячы на дасягнутыя вялізарныя посьпехі, усё-ж пры нашых мажлівасьцях зьяўляюцца зусім невыстарчальнымі.

Пэўная частка калгасаў не змагаецца за новы прыліў, не вядзе адпаведнай работы сярод аднасобных бядняцка-сераднякіх мас, ня ўцягвае аднасобнікаў у калектывы. Тэндэнцыя замкнутасьці, якая толькі дапамагае кулаку і тармозіць новы прыліў, мае месца ў цэлым радзе нашых с.-г. арцелей. Правапартуністычная стаўка на самацёк і неждаўнае ці нядзольнасьць увязаць гаспадарча-палітычныя кампаніі з барацьбой за новы прыліў — вось прычыны зусім слабога росту паасобных калгасаў. Работа калгасаў у абсягу выкананьня загатоўчых пляжаў усё яшчэ зьяўляецца невыстарчальнай. Яна-б магла быць значна большай.

III Усебеларускі зьезд калгасаў, які зьбіраецца напярэдадні другой бальшавіцкай вясны, павінен прайсьці пад знакам мабілізацыі калгасных мас на барацьбу за выпраўленьне і зьнішчэньне гэтых недахопаў.

Усе свае сілы, усю сваю энэргію перадавікі сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, якія сёньня сабраліся на Ўсебеларускі калгасны зьезд, павінны накіраваць на выкананьне задач веснавой пасеўнай кампаніі.

Крута падняць тэмпы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, ліквідаваць ганебнае адставаньне ў падрыхтоўцы, злучыць падрыхтоўку да сяўбы з арганізацыяй новага магутнага прыліву, па-бальшавіцку рэалізаваць гістарычную адозву СНК і ЦК аб кантрактацыі — вось задачы, выканаць якія павінен зьезд ва што-б там ні стала.

ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ БССР АДЗНАЧАЮЦЬ АДКРЫЦЬЦЁ ЗЬЕЗДУ НОВЫМ УЗДЫМАМ ТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ, АРГАНІЗАЦЫЯЙ СУСТРЭЧНЫХ ПАСЕЎНЫХ ПЛЯНАЎ, РАЗГОРТВАНЬНЕМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА. ЗАКЛІК КАЛГАСАЎ «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», «ЧЫРВОНЫ ФАКЕЛ» і «ПОЛЫМЯ» ПАВЯЛІЧЫЦЬ ПЛЯНЫ СЯЎБЫ, КАБ ЛІКВІДАВАЦЬ АСЕНЬНІ НЕДАСЕЎ, ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАЧУТЫ КОЖНЫМ ДЗЛЕГАТАМ ЗЬЕЗДУ, КОЖНЫМ КАЛГАСЬНІКАМ БССР.

Трэба выкарыстаць гэту дасканалую ініцыятыву для мабілізацыі калгасных мас на барацьбу за перавыкананьне пасеўных пляноў. ЛЁЗУНГ — НІ АДНАГО ГЭКТАРА НЕЗАСЕЯНАГА — ВЫКАНАЦЬ ПЛЯНЫ ЗАСЕВУ ТЭХКУЛЬТУР НА ЎСЕ 100 ПРОЦ. — ПАВІНЕН СТАЦЬ ПРАКТЫЧНЫМ ЛЁЗУНГАМ ЗЬЕЗДУ, ЛЁЗУНГАМ, ВАКОЛ ЯКОГА ЗЬЕЗД ПАВІНЕН ЗГРУПАВАЦЬ УСЮ СВАЮ УВАГУ.

Тварам да задач другой бальшавіцкай вясны, тварам да тэхнікі, тварам да сёнешніх аднасобнікаў — заўтрашніх калгасьнікаў — бальшавіцкая праграма зьезду. І абавязак кожнага дэлегата, абавязак усяго зьезду ў цэлым, абавязак усіх калгасьнікаў, каб гэтая праграма пад кіраўніцтвам партарганізацый была выканана.

Калгасы павінны аўладаць тэхнікай з тым, каб яшчэ хутчэй рушыцца наперад па шляху сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Калгасы павінны аўладаць тэхнікай з тым, каб ва ўсеўзбраеньні спаткаць другую бальшавіцкую вясну.

Калгасы павінны аўладаць тэхнікай с.-г. вытворчасьці, з тым, каб быць яшчэ больш узброенымі ў барацьбе з кулацтвам і яго агентурай—апартуністамі.

За дакладны, выразны ўлік працы ў калгасах, бо «сацыялізм — гэта ўлік» (Ленін).

За правільную арганізацыю калгаснае працы, за разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, за пераход на брыгадную зьдзельшчыну ў калгасах, бо выкананьне гэтых задач зьяўляецца адным з рашаючых вагароў далейшага ўзмацненьня калгаснага руху.

За бальшавіцкую падрыхтоўку да другой калгаснай вясны і арганізацыю новага калгаснага прыліву, за поўную рэалізацыю адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі яравых пасеваў, за сустрэчныя пасеўныя пляны другой калгаснай вясны.

Мацней ўдар па кулаку, які працве затармазіць новы калгасны прыліў і сарваць падрыхтоўку да сяўбы, па яго памочніках — правых і «левых» апартуністах.

Бальшавіцкія тэмпы плюс тэхніка ў рэканструкцыйны пэрыяд вырашаюць усё. Зьезд павінен мабілізаваць калгасныя масы на барацьбу за аўладаньне тэхнікай, за бальшавіцкія тэмпы ў ажыцьцяўленьні задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, за колькасную і якасную перавыкананьне плянаў другой калгаснай вясны і арганізацыю новага магутнага прыліву ў калгасы.

Узмацніць партыйнае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам

16-га сакавіка ў доме Камасьветы адбыўся агульнагарадзкі сход партактыву па пытаньнях усесаюзнай нарады па рабселькораўскім руху і ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва ім і нізавым друкам.

Дакладчыкі—прадстаўнік ЦО партыі—«Праўды» тав. Рэзьнікаў і прадстаўнік Культпропу ЦК КП(б)Б—рэдактар газэты «Рабселькор» тав. Курцік, пасьля высьвятленьня асноўных задач і значэньня ўсесаюзнай нарады, як нарады, якая азначае сабою пералом у рабкораўскім руху, спыніліся на сацыяльных і палітычных момантах, якія выклікаюць гэты пералом.

Некалькі лічбаў, якія характарызуюць рост рабселькораўскага руху і значэньне друку. Калі ў 1928 годзе падпісчыкаў па СССР налічвалася 18 тысяч, дык у 1930 годзе іх было 150 тысяч, а ў 1931 г. будзе яшчэ ў таўтара раза больш. 283-ма газэтамі за 1929 год надрукавана 1.900.000 допісаў, з якіх надрукавана 342 тысячы. Замест 200 тысяч рабселькораў у адбудоўчы пэрыяд зараз маем 3 мільёны іх.

З боку якасная ж таксама маем поспехі. Рабселькораўскім руху, якое завае ў рабселькораўскім руху, якое завае ў рабселькораўскім руху, якое завае ў тым, што ад пасыўных адлюстраваньнікаў у мінулым—рабселькораў зараз занялі больш высокую і адказную ролю арганізатараў барацьбы за правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі.

Рабселькор зараз—гэта ня толькі рабочы, але і перадавы рабочы-ўдарнік, а рабселькор-ударнік—гэта цэнтральная фігура рабселькораўскага руху. Таму ясны і сэнс другой часткі лёзунгу: «Кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор», якая заключаецца ў тым, каб кожны ўдарнік уцягнуўся ў рабселькораўскую работу.

А вось гэтага якраз не разумеюць правыя апартуністы. Два гады назад т. Бухарын на IV-ай усесаюзнай нарадзе рабселькораў прабаваў навязаць антыпартыйныя, правапартуністычныя погляды на рабселькораўскі рух. Сутнасьць гэтых установак зводзілася да абмежаваньня задач рабселькораў культурна-асьветнымі задачамі. Каранёны гэтых установак выцякаюць з няправільнай ацэнкі сучаснасьці клясавых сіл у краіне, у барацьбе з клясавымі ворагамі і іх агентурай у радах партыі — правымі і «левымі» апартуністамі і прыміранцтвам да іх».

На падставе матар'ялаў абсьледваньня культпропам Менгаркому 50-ці друкаваных і насьпечных газэт, партактыў канстатаваў вялізарныя дасягненьні і ўзрослую ролю менскага нізавога друку ў сацыялістычным будаўніцтве. Аднак, побач з гэтым, партактыў адзначыў «наяўнасьць буйных палітычных памылак, палітычнай блізарукасьці і недаацэнкі барацьбы на два фронты, супроць правай небясьпекі — галоўнай на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прыміранцтва да іх у радзе паасобных фабрычных газэт».

Партактыў падкрэсьліў значнае адставаньне раду газэт ад важнейшых задач барацьбы за прамфінплян і, асабліва зазастрануў увагу партарганізацый на невыстарчальным рэагаваньні на зьмечаныя ў нізавым друку допісы, адзначыў адсутнасьць у радзе паасобных выпадкаў выстарчальнага рашучага рэагаваньня на факты простага заціску самакрытыкі і нават замаскаваных форм ціскаваньня рабкораў. Партактыў з усёй рашучасьцю падкрэсьліў недапушчальнасьць недаацэнкі значэньня настойлівай і пасьлядоўнай барацьбы за ленінскую нацыянальную палітыку партыі, якая наглядаецца з боку паасобных насьцелгазэт.

Партактыў, разглядаючы ўсе гэтыя недахопы, як вынік невыстарчальна-сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва з боку нізавых партарганізацый, слабога падбору кіраўнічага складу рэдкалегій, патрабаваў ад усіх партыйных арганізацый у самы бліжэйшы тэрмін забясьпечыць кіраўніцтва нізавым друкам.

Адзначыўшы яшчэ рад канкрэтных задач, якія стаяць перад Менскай партарганізацыяй, партактыў, «поўнасьцю ўхваляючы пастанову Менгаркому КП(б)Б на пытаньні партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам, у якой дана зусім правільная ацэнка становішчу рабкораўскага руху ў Менску і вызначаны канкрэтныя задачы на далейшы час, — абяцае прыняць усе меры да поўнага ім выкананьня і забясьпячэньня яшчэ больш аднаязнай ролі рабкораўскага руху ў разгорнутым сацыялістычным наступленьні на ўсім фронце».

Д. Ч.

АРГАНІЗАЦЫЯЙ СУСТРЭЧНЫХ ПЛЯНАЎ І СПАБОРНІЦТВАМ КАЛГАСЫ СУСТРАКАЮЦЬ ЗЬЕЗД

Ні аднаго гэктара незасеянай зямлі!

Перавысіць заданьні па засеве яравога кліну,
Пакрыць недасеў азіміны,
Скарыстаць бросавыя землі,
Ліквідаваць незаняты папар,
Палепшыць сенажаці ў абавязковым парадку—

вось прапановы перадавых калгасаў. Зьезд павінен абмеркаваць іх і забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне пляну другой бальшавіцкай вясны

Масавая арганізацыя сустрэчных плянаў зьявіцца руйнуючым ударам па апартуністах і кулаках, якія прабуюць затрымаць разгортваньне сталінскага прызыву і баявую падрыхтоўку да вясны

Ніводнага га незанятага папару

КОЙДАНАВА.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ СТАЛЁВАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ КАЛГАСНЫ РУХ ДАСЯГНУЎ ВЯЛІЗАРНЫХ ПОСЬПЕХАЎ. АДНАК, КАВ ЗАМАЦАВАЦЬ І ДАЛЕЙ РАЗЬВІВАЦЬ ГЭТЫЯ ПОСЬПЕХІ, НЕАБХОДНА ЦЬВЕРДАЕ І ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І ЎРАДУ АБ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ВЁСКІ І Ў ПРЫВАТНАСЬЦІ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ.

ПАРТЫЯ ВЫСУНУЛА ЛЁЗУНГ—НІ АДНАГО НЕЗАСЕЯНАГА ГЭКТАРА ЗЯМЛІ. І САПРАЎДЫ, КОЖНЫ НЯВЫКАРЫСТАНЫ КАВАЛАК ЗЯМЛІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЎДАРАМ ПА ПЯЦІГОДЦЫ, ЎДАРАМ ПА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ВЁСКІ.

У МІНУЛУЮ ВОСЕНЬ ЧАСТКА КАЛГАСАЎ БССР НЕДАВЫКАНАЛА ПЛЯНУ АЗІМАЙ СЯЎБЫ. МЫ, КАЛГАСЬНІКІ АРЦЕЛІ «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», ЯКАЯ АБ'ЯДНАЕ 143 ГАСПАДАРКІ, ЛІЧЫМ, ШТО 3-ЦІ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД КАЛГАСАЎ НЯ МОЖА І НЕ ПАВІНЕН ПРАЙСЬЦІ МІМА ГЭТАГА ФАКТУ. НЕАБХОДНА ПРЫНЯЦЬ ЎСЕ МЕРЫ, КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫВЫ АБ ПАПЫРЭНЬНІ ЯРАВОГА КЛІНУ, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ВЫЗНАЧАНАГА ПАШЫРЭНЬНЯ, А ТАКСАМА ПАКРЫЦЬ НЕДАСЕЎ АЗІМІНЫ.

У СУВЯЗІ З ГЭТЫМ МЫ ЗВАРАЧАЕМСЯ ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСАЎ З ПРОСЬБАЙ ПАСТАВІЦЬ І АБГАВАРЫЦЬ НА ЗЬЕЗДЗЕ НАШЫ НАСТУПНЫЯ ПРАПАНОВЫ:

АБАВЯЗАЦЬ КАЛГАСЫ ЗАСЕЯЦЬ У ЧАСЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ВОЛЬНУЮ ПЛОШЧУ ШЛЯХАМ СКАРЫСТАНЬНЯ ЗАКІНУТЫХ ЗЯМЕЛЬ.

ЗУСІМ ЛІКВІДАВАЦЬ ПАПАРНЫ КЛІН І ПЕРАЙСЬЦІ НА ЗАНЯТЫ ПАПАР.

НАЯЎНУЮ ПЛОШЧУ СЕНАЖАЦІ Ў КАЛГАСАХ ПАЛЕПШЫЦЬ У АБАВЯЗКОВЫМ ПАРАДКУ, У ПРЫВАТНАСЬЦІ ШЛЯХАМ ПАДСЕВУ ПА ВЕРХУ СУМЕСІ ТРАЎ.

НАШЫ ПРАПАНОВЫ МЫ ПАДМАЦОЎВАЕМ ВЫСОЎВАНЬНЕМ СУСТРЭЧНАГА ПАСЕЎНАГА ПЛЯНУ. ПАВЯЛІЧВАЕМ ЗАДАНЬНЕ РВК (ЯКОЕ ПРАДУГЛЕДЖВАЕ ПАШЫРЭНЬНЕ НАШАГА ЯРАВОГА КЛІНУ НА 27 ПРОЦ.) НА 43 ПРОЦ. Г. ЗН. МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ЯРАВЫ КЛІН СУПРОЦЬ МІНУЛАГА ГОДУ НА 70 ПРОЦ. ТАКІМ ЧЫНАМ, КАЛГАС ЗАСЕЕ ГЭТАЙ ВЯСНОЙ ПЛОШЧУ Ў 1.104 ГЭКТ., ПРЫЧЫМ 110 ГЭКТ. ЗА ЛІК КАНЧАТКОВАЙ ЛІКВІДАЦЫІ ПАПАРУ І 881 ГЭКТ. ЗА ЛІК ПОЎНАГА СКАРЫСТАНЬНЯ ЎСІХ ЗАКІНУТЫХ ЗЯМЕЛЬ.

ПРЫМАЮЧЫ НА СЯБЕ ТАКІЯ БАЛЬШАВІЦКІЯ АБАВЯЗКІ, АДНАЧАСОВА ЗАВЯЛЬСЬНЕЧАЕМ ІХ ВЫКАНАНЬНЕ ШЛЯХАМ РАЗГОРТВАНЬНЯ САПРАЎДЫ ЎДАРНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ НА АСНОВЕ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА.

МЫ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО 3-ЦІ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД КАЛГАСАЎ ПРЫМЕ НАШЫ ПРАПАНОВЫ, ШТО ЎСЕ КАЛГАСЫ БССР ІХ ПАДХОПЯЦЬ, ВЫСОЎВАЮЧЫ СУСРЭЧНЫЯ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ І АДНАЧАСОВА ПРЫМАЮЧЫ НАЛЕЖНЫЯ МЕРЫ ДА ПОЎНАГА ІХ ВЫКАНАНЬНЯ.

КАЛГАСЬНІКІ АРЦЕЛІ «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ».

„Пашыраем яравы клін на 115 га"

РАСНА.

Задачы пасьляховага выкананьня народна-гаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуюць максымальнага напружаньня прадукцыйных сіл краіны. Сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі—саўгасы і калгасы—пры ўмове поўнага скарыстаньня ўсіх зямель змогуць з посьпехам выканаць і нават перавыканаць ускладзеныя на іх задачы—забясьпечыць сацыялістычную прамысловасьць сырцом і прадуктамі харчаваньня рабочую клясу.

Агульны сход калгасу «ЧЫРВОНЫ ФАКЕЛ», які налічвае 279 калгасьнікаў, улічваючы вялікія адказныя задачы, якія стаяць перад калгасамі, пры абгаварэньні свайго вытворчага пляну знайшоў невыстарчальным павялічэньне яравога кліну на 17 проц. АГУЛЬНЫ СХОД ЛІЧЫЦЬ НЕАБХОДНЫМ ВЫСУНУЦЬ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН, ЯКІМ АБАВЯЗВАЕЦЦА ДАДАТКОВА ЗАСЕЯЦЬ 25 ГЭКТ., Г. ЗН. ПЛОШУ, ЯКАЯ БЫЛА НЕЗАСЕЯНА Ў ЧАСЕ АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ. УСЯГО МЫ ПАШЫРАЕМ ЯРАВЫ КЛІН НА 115 ГЭКТ. ЗА ЛІК ПОЎНАГА СКАРЫСТАНЬНЯ ЗАПУШЧАНЫХ ЗЯМЕЛЬ І ЗЬНІШЧЭНЬНЯ НЕЗАНЯТАГА ПАПАРУ.

Наш калгас спэцыялізуецца ў галіне жывёлагадоўлі. Каб хутчэй ажыцьцявіць спэцыялізацыю, мы сёлета максымальна пашыраем плошчу пад кармавымі культурамі. Калі летась наш калгас засяваў 46 гэкт. клубня і кораньплодамі, дык сёлета мы засеем 80 гэкт. Замест 44 гэкт. бульбы мы засеем 60 гэкт., замест 100 гэкт., канюшыны—175 гэкт.

Насеньня для засеву ўсіх адзначаных культур у нас ёсьць. Усё насеньне здэсартавана. Страхавыя фонды ссыпаны. Увесь інвэнтар, цягавая сіла і браніраваныя фуражныя фонды падрыхтаваны.

Паводле нашага сустрэчнага пляну, уся зямельная плошча калгасу (за выключэньнем вызначанай пад азіміну) будзе скарыстана.

Ажыцьцяўленьне нашага сустрэчнага патрабуе дружнай і ўдарнай работы ўсіх калгасьнікаў у часе веснавой сяўбы. МЫ АБЯЦАЕМ 3-МУ ЎСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЬЕЗДУ КАЛГАСАЎ НАШ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ВЫКАНАЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ.

Адначасова мы зварачаемся да ўсебеларускага зьезду калгасаў з прапановай:

Не павінна застацца ні аднаго гэктара незасеянай зямлі. Яравы клін павінен быць пашыран ня менш, чым на 17 проц. Але гэтага мала. Трэба цалкам пакрыць недасеў азіміны, які меў месца ў некаторых калгасах. Усебеларускі зьезд калгасаў павінен абавязаць калгасы ліквідаваць асеньні прарыў. Дэлегаты зьезду павінны зьявіцца пачынальнікамі ў арганізацыі сустрэчных калгасных пасеўных пляноў, якія прадугледжвалі-б ня толькі павялічэньне веснавога заданьня, але і ліквідацыю асеньніх прарываў. МЫ ЛІЧЫМ, ШТО СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ ПАВІННЫ КАНКРЭТНА ВЫЗНАЧЫЦЬ ПАШЫРЭНЬНЕ ПЛОШЧЫ ІМЕННА ПАД ТЭХНІЧНЫЯ І КАРМАВЫЯ КУЛЬТУРЫ, КАБ ГЭТЫМ САМЫМ ХУТЧЭЙ ДАБІЦЦА ВЫРАШЭНЬНЯ ЗАДАЧ СПЭЦЫЯЛІЗАЦЫІ.

Няхай жыве камуністычная партыя — правадыр сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі!

Няхай жыве 3-ці Ўсебеларускі зьезд калгасаў!

АГУЛЬНЫ СХОД КАЛГАСУ «ЧЫРВОНЫ ФАКЕЛ».

Павялічваем пасеўнае заданьне на 60 проц.

ПЛЕШЧАНІЦЫ.

Адкрыцьцё 3-га Ўсебеларускага зьезду калгасаў калгасьнікі арцелі імя Мархлеўскага адзначаюць высоўваньнем сустрэчнага пасеўнага пляну, які прадугледжвае пашырэньне яравога кліну супроць мінулага году на 60 проц.

Калгасьнікі даюць абяцаньне зьезду па-бальшавіцку змагацца за выкананьне ўсіх дырэктыў партыі і ўраду аб правядзеньні другой бальшавіцкай вясны.

У адказ на вылазкі інтэрвэнтаў і іх агентаў у СССР, члены калгасу імя Мархлеўскага яшчэ шчыльней згуртуюць свае рады вакол камуністычнай партыі для ўпартай барацьбы з кулаком, абавязваюцца разгарнуць вялікую масавую работу па калектывізацыі, каб забясьпечыць суцэльную калектывізацыю раёну і ліквідацыю кулацтва як класы на гэтай базе.

Бліскучыя вынікі

работы брыгад калгаснага зьезду

ПРАПОЙСК

ДЗЬВЕ БРЫГАДЫ РАЁННАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСАЎ, ЯКІЯ ВЫЕХАЛІ Ў СЕЛЬСАВЕТЫ ДЛЯ РАЗГОРТВАНЬНЯ МАСАВАЙ РАБОТЫ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ Ў КАЛГАСЫ, ДАБІЛІСЯ ВЯЛІКІХ ПОСЬПЕХАЎ. БРЫГАДАМІ АРГАНІЗАВАНА НОВЫХ 11 КАЛГАСАЎ, ЯКІЯ АБ'ЯДНАЛІ 826 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

ЗА АПОШНІ ЧАС ПРОЦАНТ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў ПРАПОЙСКІМ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ З 16,2 ДА 22,3 ПРОЦ.

464 калгасьнікі сталінскага прызыву

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

ЗА ЧАС СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ ў калгасы Полацкага раёну ўступілі НОВЫЯ 464 ГАСПАДАРКІ.

У кожным калгасе арганізаваны вярбоўчыя брыгады, якія разгарнулі работу па ўцягненьні ў калектывы аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Вялікі ўплыў на аднаасобнікаў зрабіў пробны выезд у поле, які быў наладжан калгасам «Гігант». Ударная падрыхтоўка да сяўбы калгасьнікаў арцелі «Гігант» выклікала прыліў. Гэты калгас за апошні час вырас на 50 проц. Аналягічныя розультаты дасягнуты і іншымі калгасамі, якія наладзілі пробныя выезды ў поле.

Ан. П.

За распрацоўкай сустрэчнага пасеўнага пляну (калгас «Новае жыцьцё», Койданаўскі раён.

Пакрываем недасеў азімага кліну

СМАЛЯВІЧЫ.

Абмеркаваўшы пасеўны плян нашага калгасу «Полымя», мы лічым, што вызначаныя ім заданьні могуць быць ня толькі цалкам выкананы, але і перавыкананы. У прыватнасьці, мы, калгасьнікі арцелі «Полымя», знаходзім невыстарчальным намечанае раённымі арганізацыямі пашырэньне яравога кліну. Трэба прыняць пад увагу, што, з прычыны недахвату працоўнай і цягавай сілы, а таксама невыстарчальнай арганізацыі працы, у мінулую восень мы недавыканалі заданьне па засеве азіміны на 30 гэкт.

Каб ліквідаваць гэты буйны прарыў, мы высоўваем сустрэчны пасеўны плян, якім абавязваемся павялічыць кантрольнае заданьне па засеве яравых на 30 гэкт., якіх мы недасеялі мінулай восенью.

Прымаючы такую пастанову, мы зварачаемся да трэцяга ўсебеларускага зьезду калгасаў з наступнай прапановай:

У часе асеньняй пасеўнай кампаніі 1930 г. рад маладых калгасаў БССР, з прычыны, галоўным чынам, дрэннай арганізацыі працы, недавыкалі заданьне па засеве азімых. Мы лічым, што гэты прарыў павінен быць зараз ліквідаваны, бо для гэтага ёсьць усе магчымасьці: набытая практыка калектыўнай працы, значны прыліў новых гаспадарак, павялічэньне цягавай сілы і г. д. Ліквідацыя прарыву ў выкананьні пляну асеньняй сяўбы зьявіцца лепшым адказам апартуністам, якія не маглі і не жадалі мабілізаваць масы калгасьнікаў на барацьбу з труднасьцямі. Пакрыцьцё зараз недасеву азіміны зьявіцца моцным ударам па кулаку, які ня спыняе агітацыі за скарачэньне яравога кліну.

Мы прапануем 3-му ўсебеларускаму зьезду калгасаў абмеркаваць гэтае пытаньне, як вышэйшаму органу калгасаў, вынесьці пастанову, якая абавязала-б калгасы, што недавыканалі пляну асеньняй сяўбы, ліквідаваць свае прарывы ў часе веснавой пасеўнай кампаніі.

Мы спадзяемся, што ўдзельнікі ўсебеларускага зьезду калгасаў зьявяцца ўдарнікамі па ажыцьцяўленьні гэтай пастановы, што яны арганізуюць моцную хвалю сустрэчных пасеўных пляноў, якія прадугледжвалі-б ня толькі пашырэньне яравога кліну ў адпаведнасьці з пастановамі партыі і ўраду, але таксама пакрылі-б недасеў азіміны.

Высоўваючы сустрэчны плян аб павялічэньні заданьня па яравым пасеве на 30 гэкт., якіх мы недасеялі ўвосень, калгасьнікі абавязваюцца гэтыя 30 гэкт. засеяць пераважна кармавымі культурамі і заклікаюць іншыя калгасы БССР, высоўваючы сустрэчныя пасеўныя пляны, павялічваць плошчу пераважна пад тэхнічнымі і кармавымі культурамі.

КАЛГАСЬНІКІ С.-Г. АРЦЕЛІ «ПОЛЫМЯ».

Расьце калгасная хваля

СМАЛЯВІЧЫ. (Наш кар.).

На працягу першых тыдняў сталінскага прызыву па Смалявіцкім раёне арганізавалася новых 16 калектываў, у якія ўступіла 600 бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Хваля сталінскага прызыву пашыраецца з кожным днём.

Арцельны.

Калгас імя Дзяржынскага арганізаваў

11 калектываў, 9 ініцыятыўных груп, падрыхтаваўся да вясны

ЛАГОЙСК.

У падарунак 3-му ўсебеларускаму зьезду калгасаў калектыў імя Дзяржынскага арганізаваў 5

Павысім баяздольнасьць вясковых ячэек КП(б)Б
у іх змаганьні за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі

Перавыбары кіруючых органаў вытворчых саўгасных, калгасных і вясковых парт'ячэек павінны праходзіць пад знакам самаправеркі іх работы, пад знакам разгортваньня жорсткай пралетарскай самакрытыкі

НА КІРУЮЧУЮ РАБОТУ ТЫХ, ХТО НА СПРАВЕ ДАВЁЎ СВАЮ ІДЭЙНУЮ НЕПАХІСНАСЬЦЬ, ХТО ЗДОЛЕН ВЫРАЗНА АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ Ў ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ

Аб перавыбарах кіруючых парт-органаў на прадпрыемствах

Пастанова бюро Менгаркому КП(б)Б

Надыходзячыя перавыбары парторгамаў павінны быць скарыстаны для далейшай мабілізацыі ўвагі партарганізацый і шырокіх мас рабочых вакол задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, рашучай перабудовы партыйнай работы ў напрамку перанясеньня цэнтру цяжару ў групу, брыгаду, вучастак, паваротку ўвагі ўсіх партыйных, гаспадарчых, прафэсіянальных арганізацый і ўсіх камуністаў тварам да пытаньняў сацыялістычнай рацыяналізацыі, да аўладаньня тэхнікай.

Перавыбары павінны быць скарыстаны для далейшай барацьбы на два фронты, у першую чаргу з правым ухілам, а таксама з «левымі» загібамі, для далейшага разгортваньня бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі ўсіх недахопаў у рабоце партарганізацыі.

Выходзячы з гэтага, бюро гаркому прапануе:

1. Перавыбарчую кампанію пачаць 25-III і скончыць да 1-V 31 г.

2. Да 25-га сакавіка дасканала вызначыць усе тыя вытворчыя вучасткі, дзе павінны быць арганізаваны партгрупы, кіруючыя пастановай бюро гаркому, што ў кожнай вытворчай адзініцы, дзе ёсьць 3 члены партыі, павінна быць створана партгрупа.

3. Перавыбары арганізаваць такім парадкам, каб у першую чаргу былі выбраны групоргі, потым бюро цэх'ячэек, а пасьля — бюро партколектыву. Да перавыбараў прыстасоваць і арганізацыю сэкцыяў пры цэх'ячэйках і бюро партколектыву, у асноўным выходзячы з тых прынцыпаў, якія ўстаноўлены пастановай бюро гаркому ад 2 сакавіка 1931 г.

4. Да перавыбараў правесьці шырокую самаправерку ўсёй работы ячэек, канцэнтраваўшы яе, галоўным чынам, вакол наступных пытаньняў: як ячэйка здолела забясьпечыць сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы і барацьбу з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі на прадпрыемстве, як ячэйка здолела забясьпечыць выкананьне прамфінплану ўдарнага кварталу і першага кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі па колькасных і якасных паказальніках, як ячэйка арганізавала сыстэматычную работу па вярбоўцы ў партыю перадавых рабочых-ударнікаў, як забясьпечана правядзеньне ленінскай нацпалітыкі і выкананьне пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б па гэтым пытаньні.

Ва ўсёй рабоце па праверцы павінна быць забясьпечана бязьлітасная, бальшавіцкая самакрытыка ва ўсёй рабоце ячэек. Для арганізацыі самаправеркі павінны быць зараз-жа створаны брыгады з членаў ячэек.

5. Гарком рэкамэндуе для абмену вопытам арганізаваць узаемную самаправерку парткалектываў аднолькавых галін прамысловасьці, а таксама і парткалектываў шэфствуючых прадпрыемстваў над установамі.

Даручыць арганізацыйна - інструктарскаму аддзелу распрацаваць парадак правядзеньня гэтай праверкі.

6. Выбары павінны быць скарыстаны для ўцягненьня ў кіруючыя парторганы прадпрыемстваў лепшых ударнікаў-камуністаў, якія паказваюць прыклады бальшавіцкіх тэмпаў работы і здольны змагацца на два фронты за генэральную лінію партыі, а таксама для павялічэньня ў складзе кіруючых парторганаў камуністак-работніц.

7. Уся работа па перавыбарах павінна праводзіцца на адкрытых сходах ячэек з максымальным прыцягненьнем на гэтыя сходы шырокіх мас беспартыйных рабочых.

8. Арганізацыйна-інструктарскаму аддзелу распрацаваць календарны план перавыбараў і выпускаць прадстаўнікоў гаркому для дапамогі ячэйкам у правядзеньні перавыбарчай кампаніі.

Слуцкая партарганізацыя ў змаганьні за бальшавіцкую вясну

Слуцкая райпартарганізацыя падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны распачала яшчэ ў сьнежні месяцы мінулага году. Але перыяд, які прапішоў са сьнежня і да цяперашняга, ня даў тых патрэбных практычных вынікаў, якія б забясьпечвалі пасьпяховае ажыцьцяўленьне дырэктывы партыі па разгортваньні калектывізацыі і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Гэты перыяд быў патрачан на ўсякія пасяджэньні, сходы і г. д. Толькі в 20 лютага партарганізацыя зрабіла круты паварот у напрамку выпрашэньня канкрэтных задач, звязаных з падрыхтоўкай да другой бальшавіцкай вясны і разгортваньнем калгаснага будаўніцтва ў раёне.

У канцы лютага райком мабілізаваў 50 таварышоў партыйнага актыву і 90 чалавек прафактыву на 1½ месяца для работы на вёсцы. Першая нарада ўпаўнаважаных райкому, сакратароў ячэек КП(б)Б і ЛКСМБ, якая адбылася 1-га сакавіка, дала магчымасьць канстатаваць, што **першая дэкада сапраўды баявой работы дала прыліў у калгасы 214 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.** Партарганізацыя выправіла памылку, якая была дапушчана ў раёне. Гэта памылка вывялася ў тым, што раённыя ўстановы хадайнічалі перад цэнтральнымі органамі аб зьніжэньні кантрольнай лічбы насёўнай плошчы. Раённы план, накіраваны на пашырэньне насёўнай плошчы, зараз даведзен да кожнага калгасу і сельсавету і ў бліжэйшыя дні будзе даведзен да кожнай адноасобнай гаспадаркі.

Як правіла, калгасы чэдуць упарадзе па падрыхтоўцы да сяўбы за адноасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. Большасьць калгасаў поўнасьцю атысьцілі насеньне і разгарнулі работу па рамонце інвэнтару. Ня ўсе калгасы забясьпечаны фуражом на перыяд пікавых работ. Ёсьць калектывы, дзе з прычыны праўленскай нядбайнасьці ў часе зборачнай кампаніі пытаньне з кармавой базай пастаўлена вельмі сур'ёзна. Гэтым калгасам патрэбна вялікая дапамога з тым, каб яны маглі в поспехам правесьці другую бальшавіцкую вясну.

Поспехі, якія набыты ў нарасганьні тэмпаў калектывізацыі, атрымаліся дзякуючы таму, што партарганізацыя ў цэлым здолела стаць на чале кіраўніцтва падрыхтоўкай да веснавой сяўбы, здолела ўвязаць не з разгортваньнем калгаснага прыліву. Партарганізацыя перамагла тыя самацёчныя настрої, якія панавалі ў першыя два месяцы падрыхтоўкі да вясны. Партактыў і шырокія партыйныя масы мабілізаваны на выкананьне канкрэтных задач, якія пастаўлены перад арганізацыяй на бліжэйшы перыяд. Рад парт'ячэек (**Урэцкая, Ленінская і Цараўская**) далі сапраўды баявы ўзоры змаганьня за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за новы калгасны прыліў. У тых сельсаветах, якія абслугоўваюць гэтыя ячэйкі, у калгасным будаўніцтве і падрыхтоўцы да сяўбы набыты вялікія поспехі.

Аднак, побач з такімі ячэйкамі, у раёне ёсьць у наяўнасьці і такія, якія ніяк ня могуць узяць баявы тэмп у рабоце, ня могуць перамагчы апартуністычных настроў самацёку. **Амговіцкая, Некрашоўская ячэйкі, калгасу «І жніўня»** і інш. сваю бязьдзейнасьць імкнуцца прыкрыць «аб'ектыўнымі прычынамі». Пералічаныя ячэйкі ня стапі сапраўднымі барацьбітамі за новы калгасны прыліў, за бальшавіцкую вясну.

6-ты раённы зьезд саветаў прайшоў пад лёзунгам павароту ўсіх саветаў да задач калектывізацыі і актыўнага змаганьня за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Рад сельсаветаў гэты паварот забясьпечваюць у сваёй штодзённай канкрэтнай рабоце. Аднак, такія сельсаветы, як **Лучнікоўскі, Прошчыцкі і Стараўскі**, ня здолелі стаць тварам да задач калектывізацыі. У гэтых сельсаветах няма ні аднаго калгасу.

У Амговіцкім, Бокшыцкім, Сярагаўскім, Дарасінскім сельсаветах няма калгаснага прыліву.

Раённая газэта «**Ленінскі шлях**», вядучы бязьлітаснае змаганьне за генэральную лінію партыі, па-сапраўднаму ўзялася за ажыцьцяўленьне задач калектывізацыі і насёўнай кампаніі. Газэта ўключылася ў дэкаду праверкі і гэтым самым дапамагла вывесьці становішча і ступень падрыхтаванасьці да сяўбы. Газэта праз высылку брыгад, праз выязную рэдакцыю праводзіць вялікую практычную работу па замацаваньні калгасаў.

Горш стаіць справа з падрыхтоўкай да будаўнічага сэзону ў сьвінагадоўчых саўгасах. Тэмпы вываскі лесаматэр'ялаў не адпавядаюць тым задачам, якія пастаўлены ў галіне будаўніцтва.

МТС разгарнула шырокую работу па рэалізацыі трактарных акцый. Аднак, раённыя ўстановы яшчэ ня ўсё зрабілі для таго, каб МТС, як сьлед, магла падрыхтавацца да вясны. Станцыя ня мае складу на матар'ялы для машын, не пад возіцца лёс для разгортваньня будаўніцтва.

Прафсаюзы і камсамол усё яшчэ бязьдзейнічаюць у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Большасьць камсамольскіх ячэек не разгарнулі баявой работы па калектывізацыі. Фракцыі райпрафсавету і райкому камсамолу трэба неадкладна перакінуцца на ажыцьцяўленьне асноўных палітычных задач партыі.

За апошнюю дэкаду ў раёне шырока разгарнулася работа на арганізацыі станічнага прыліву ў калгасы. Прапрацоўка тэзісаў тав. Якаўлева да VI Усесаюзнага зьезду саветаў выклікала масавае ўскупленьне бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы. Асабліва гэта выразна мы можам бачыць на калгасе «Камбайн». Там у рэзультаце распрацоўкі тэзісаў тав. Якаўлева ў калгас улілося 47 гаспадарак. Такім чынам, вёска, у якой знаходзіцца «Камбайн», калектывізавана на 65 проц.

У рэзультаце баявой работы партарганізацыі на сёньняшні дзень сацыялістычны сэктар складае 22 проц. у той час, як асеньняя сяўба была праведзена пры 11 проц. Аднак, **гэты эрух Слуцкую райпартарганізацыю звдаволіць ні ў якім разе ня можа.** Трэба ўзяць яшчэ больш высокія тэмпы ў рабоце па разгортваньні калектывізацыі і падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны. Слуцкая партарганізацыя, наносячы бязьлітасныя ўдары па праяўленьнях правапартуністычнай практыкі, па «левых» перагібах, тыя задачы, якія перад ёю пастаўлены, з поспехам выканае.

КАЗАЧОК.

Грубае парушэньне дырэктыў партыі

Задачы ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі аб суцэльнай калектывізацыі і на аснове не ліквідацыі кулацтва як класы, выкананьня праграмы другой бальшавіцкай вясны — патрабуюць ад партарганізацый рашучай перабудовы сваёй работы. Капыльская партарганізацыя прыступіла да работы на бліжэйшы партарганізацыі да калгасаў і саўгасаў. Гэтымі днямі арганізаваны тры новыя кандыдацкія групы.

За апошні перыяд шырока разгарнулася работа на вярбоўцы ў партыю перадавых баяроў і калгаснікаў. Ад рабочых, батракоў і калгаснікаў паступілі 24 заявы аб прыёме ў партыю. 16 чалавек ужо зацьверджаны кандыдатамі і членамі КП(б)В.

У **Бабаўнянскім** сельсавеце сакратар парт'ячэйкі тав. **Бабкоў груба парушыў прынцыпы і дырэктывы партыі аб падвойна строгім індывідуальным падыходзе пры прыёме ў партыю новых членаў.** Бабкоў на агульна - сялянскім сходзе «прыняў» у партыю 12 чалавек. Раённая партарганізацыя павінна бязьлітасна ўдарыць па гэтым грубым скажэньні лініі партыі, якое дапушчана сакратаром ячэйкі Бабковым.

ХАЛЕПА.

Бальшавіцкай работайзамацоўваем калгасы

Кандыдацкая група, арганізаваная ў сярэдзіне 1930 г., **пры калгасе «Зьвязда»** (Вульскі раён) здолела згуртаваць увагу працоўных мас на пытаньнях калгаснага будаўніцтва, на пытаньнях арганізацыі працы, разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва паміж паасобнымі групамі калгаснікаў, у сувязі з чым дасягнула вялізарных посьпехаў па гаспадарчым замацаваньні свайго калгасу.

Кандыдацкая група ў хуткім часе вырасла ў партыйную ячэйку, якая зараз яднае больш 10 калгаснікаў, членаў і кандыдатаў партыі. Гэтымі днямі ў ячэйку 9 лепшых калгаснікаў — батракоў і беднякоў падалі заявы аб жаданьні ўступіць у ленінскую партыю. Гэты факт з усёй выразнасьцю падкрэсьлівае, што партыйная ячэйка дасягнула вялікага росту толькі дзякуючы ўпартаму змаганьню за працоўную дысцыпліну, за няўхільнае выкананьне дырэктыў партыі па важнейшых гаспадарча-палітычных кампаніях. Ячэйка здолела вакол сябе арганізаваць вялікі калгасны актыў, які ўцягваецца непасродна ў практычную работу і зьяўляецца лепшым памочнікам партыі па прапагандзе ідэі калектывізацыі сярод наўкольнага бядняцка-серадняцкага сялянства.

Ячэйка бліскуча справілася з задачай згуртаваньня вакол сябе беспартыйнага калгаснага актыву, высоўваньня лепшых калгасьнікаў ударнікаў на кіруючую работу ў сельсавет, казэрацыю, у праўленьні суседніх калгасаў.

Аб тым, што ячэйка бліскуча спраўляецца з правядзеньнем важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній, сьведчыць той факт, што яна пытаньне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы паставіла на практычнае вырашэньне ў сваім калгасе, яшчэ ў сьнежні мінулага году.

Зараз калгас «Зьвязда» добра падрыхтаваны да другой бальшавіцкай вясны; ачышчана насеньне, праверан і адрамантаваны інвэнтар, прапрацован плян веснавой сяўбы і даведзен да кожнага калгасніка. Партыйная ячэйка сумесна з калгасным актывам зараз распачала работу па падрыхтоўцы да ўборкі ярыны і азімых і да асеньняй пасеўнай кампаніі.

Заданьні па збожжазагатоўках, па ільне, па пагашэньні крэдытаў калгасам «Зьвязда» ня толькі выкананы, але і значна перавыкананы. Калгас зьяўляецца адным з лепшых, узорных у раёне па расстаноўцы сіл, па максымальным скарыстаньні інвэнтару і па паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў калгасьнікаў.

Галоўным недахопам у рабоце ячэйкі зьяўляецца тое, што яна не папулярызавала ў выстарчальнай меры сярод вакольнага бядняцка-серадняцкага сялянства ідэі калектывізацыі, не паказала посьпехаў свайго калгасу ў першую бальшавіцкую вясну, не паказала вялізарных дасягненьняў у паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў калгасьнікаў.

Толькі гэтым можна вытлумачыць адсутнасьць значнага прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгас. Асноўная задача, якая стаіць зараз перад ячэйкай калгасу «Зьвязда», гэта ўвязаць падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы з арганізацыяй калгаснага прыліву.

А. МІКУЦКІ.

Патрэбна рэарганізацыя

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў саўгасе **Харомцы** (Глускі раён) праводзіцца фарсаваным тэмпам. Загатоўлена і ачышчана поўная патрэбнасьць насеньня ўсіх відаў культур. Адрамантаваны с.-г. інвэнтар, машыны і інш.

Аднак, трэба адзначыць, што вакол задач пасеўнай кампаніі і дапамогі з боку саўгасу ў правядзеньні калектывізацыі сельскай гаспадаркі наўкольных вёсак ня створана сярод рабочых саўгасу адпаведная грамадзкая думка. Мазавая работа ў саўгасе не разгорнута. Зусім слабая ўвязка ў рабоце «трыкутніка». Партыйнае кіраўніцтва работай саўгасу зусім невыстарчальна. Такое становішча тлумачыцца тым, што ў саўгасе няма парт'ячэйкі. Камуністы саўгасу прымацаваны да вясковай парт'ячэйкі. Сакратар вясковай ячэйкі, якая абслугоўвае і саўгас, знаходзіцца за 8 клм. ад саўгасу і,з прычыны яго перагрузкі асноўнай работай, ня можа справіцца з тымі вялізарнымі задачамі работы парт'ячэйкі па абслугоўваньні сельсавету і саўгасу.

Для паляпшэньня работы ў саўгасе, для пасьпяховага выкананьня тых задач, якія пастаўлены перад гэтай гаспадаркай, мы лічым неабходным арганізаваць у саўгасе самастойную ячэйку. Аб гэтай рэарганізацыі павінен падумаць Глускі райком партыі і правесьці яе зараз, калі адбываецца справаздачна-перавыбарчая кампанія саўгасных, калгасных і вясковых парт'ячэек.

С. Ф. Д.

ВЫКАРЧАВАЦЬ АПАРТУНІСТЫЧНУЮ ПРАКТЫКУ

Ніжынская ячэйка КП(б)В (**Любаньскі раён**) ня здолела мабілізаваць мас па разгортваньне калектывізацыі, на ўзмацненьне наступленьня на капіталістычныя элементы. Ячэйка ня здолела скарыстаць усіх тых магчымасьцяй, якія ёсьць у наяўнасьці ў даным сельсавеце для разгортваньня калгаснага будаўніцтва.

На тэрыторыі сельсавету, які абслугоўвае ячэйка, ёсьць школа калгаснай моладзі, ячэйка камсамолу і досыць вялікі актыў. Усё гэта не скарыстана ячэйкай для разгортваньня новага калгаснага прыліву, для падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны. Парт'ячэйка ня толькі ня стала на чале калгаснага прыліву, а часамі тармазіла разгортваньне калектывізацыі. Камсамольская ячэйка склана брыгады па ўцягненьні ў калгасы беднякоў і сераднякоў—адноасобнікаў. Сакратар парт'ячэйкі **Жарнакаў** не дазволіў брыгадам самастойна праводзіць работу і абяцаў прымацаваць да кожнай брыгады членаў партыі. Аднак, і да гэтага часу прымацаваньне не праведзена і мерапрыемства, узьнікшае па ініцыятыве камсамольцаў, сарвана.

Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны па сельсавеце — пад пагрозай зрыву. Між тым, парт'ячэйка ня ставіла на абмеркаваньне пытаньняў, зьвязаных з пасеўнай кампаніяй.

Чым-жа займаецца парт'ячэйка?

На працягу з апошніх месяцаў былі праведзены толькі два сходы, на якіх прысутнічалі беспартыйныя. На іншых сходах разьбіраліся пытаньні склочнага характару. Яны адбываліся закрыта. Сакратар парт'ячэйкі ігнарує самакрытыку, асабліва калі яна выходзіць ад пасьценнай газэты. Усё тое, **што пішацца пра ячэйку, у насьценгазэту не прапускаецца.** Калі камсамольцы падалі заяву ў райком аб бязьдзейнасьці Жарнакава, дык ён паставіў пытаньне аб роспуску бюро камсамольскай ячэйкі.

Гэты-ж самы Жарнакаў зьяўляецца выкладчыкам школы калгаснай моладзі. Пры распрацоўцы пытаньняў на палітычныя тэмы, дае яўна няправільныя, блытаныя і палітычна-шкодныя ўстаноўкі. У прыватнасьці такія антыпартыйныя ўстаноўкі ён даваў у пытаньнях будаўніцтва сацыялізму ў адным краіне, у пытаньнях калектывізацыі.

Перавыбарчая кампанія навічна мабілізаваць партыйныя масы на выкарчоўваньне апартуністычнай практыкі на самацёк, якая пануе ў кіраўніцтве Ніжынскай ячэйкі ў пытаньнях калектывізацыі і падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны.

М. К.

Перакідкі за... самакрытыку

Лельчыцкі райком КП(б)В ужывае невыстарчальныя меры для разгортваньня жорсткай пралетарскай крытыкі і самакрытыкі. Райком, выносячы зусім правільныя і каштоўныя пастановы аб разгортваньні самакрытыкі, не забясьпечыў такога становішча, каб кожны член райкому, кожны член арганізацыі вёў змаганьне за дзейнасьць пралетарскай самакрытыкі.

Раённыя кіруючыя органы часамі вельмі нездарова рэагуюць на самакрытыку, асабліва на крытыку друку. Гэта можна прасачыць на адносінах раённых устаноў да рабселькораў. У Лельчыцкім раёне быў рад прарываў у калгасным будаўніцтве, у справе правядзеньня важнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній. Аб гэтым рабселькор **тав. Маланіч** прыязна рад дапісаў у газэце «Чырвоная Зьмена» і ў «Зьвязьдзе». У гэтых допісах выкрываюцца карэньні і прычыны прарываў, якія маюць месца на паасобных пучастках работы Лельчыцкай арганізацыі.

У допісе, які быў зьмешчан у «Зьвязьдзе» тав. Маланіч канстатаваў, што фракцыя райвыканкому в санкцыі сакратара РК КП(б)Б Іванькова адмовілася прыняць плян на бульбазагатоўках і вынесла пастанову, у якой халайнічала перад ЦВК зьменшыць кантрольную лічбу на 285 тон. У карэспандэнцыі зусім правільна адзначалася пастанова фракцыі, як правая апартуністычная практыка.

Пытаньне аб апартуністычнай пастанове фракцыі РВК разглядалася на сходзе парт'ячэйкі савецкіх устаноў. Парт'ячэйка ў сваёй пастанове адзначыла, што факты, падзеяныя ў допісе цалкам адпавядаюць сапраўднасьці. Райком-жа літаральна ня ўжыў ніякіх захадаў, не рэагаваў ні на допіс, зьмешчаны ў «Зьвязьдзе», ні на пастанову ячэйкі. Раённае парткіраўніцтва чамусьці замест рэагаваньня стала на шлях маўчаньня. Гэта **пікрзяка** паказвае, што кіраўнікі **райкому ня сталі на чало** змаганьня за разгортваньне самакрытыкі.

Нельга абыйсьці моўчкі і такога роду фактаў. Тав. Маланіч, перакінуты для работы ў Лельчыцкі раён у сувязі з ліквідацыяй акруговага апарату. І характэрна, што ён на працягу паўгода кароткага **перыяду райкомам партыі перакідваўся з работы на работу на пя 5 раз.** Гэтыя нічым неўгрунтаваныя перакідваньні нельга інакш разглядаць, як прасьледваньне рабселькора за крытыку раённых кіраўнікоў у друку.

Факт адносін сакратара райкому камсамолу да тав. Маланіча, зусім выразна паказвае, што рад раённых работнікаў не разумеюць лёзунгу партыі аб самакрытыцы. Сакратар камсамольскага райкому тав. Маланіч заявіў: «Ты вабыў, што Іванькоў зьяўляецца сакратаром райкому партыі. Ніхто нікому ня даў права кампрамэтаваць яго перад парт-арганізацыяй» (?!). Гэты факт выразна паказвае, што кіраўнік раённай камсамольскай арганізацыі ня толькі нездольны стаіць на чале мабілізацыі камсамольскіх мас на разгортваньне самакрытыкі, а навет не разумее, што задача кожнага партыйца і кожнага камсамольца дапамагаць разгортваньню самакрытыкі, не зважаючы на асобы.

Зараз, калі ў партарганізацыі правядзіцца перавыбары назавых кіруючых парторганаў, калі праводзіцца праверка разгортваньня самакрытыкі, лельчыцкая партарганізацыя павінна правесьці, наколькі рабіны камітэт КП(б)В і яго асобныя работнікі спрыялі разгортваньню бальшавіцкай самакрытыкі і не кастрыў капіруючы супроць апартуністычнай практыкі, супроць усялякіх скажэньняў генэральнай лініі партыі.

Д. З.

ПРАРЫВЫ ЛІКВІДУЮЦЦА

Саўгас «Камінтэрн» зьяўляецца адным з буйнейшых у Багомльскім раёне, мае вялікія перспэктывы для свайго далейшага разьвіцьця і ўсе неабходныя ўмовы для таго, каб быць пасаапальнай сацыялістычнай гаспадаркай сярод наўкольнага насельніцтва.

Але на справе аказалася іншае. Апартуністычнае кіраўніцтва саўгасу дапусьціла безгаспадарчасьць і расхлябанасьць у рабоце. Калі прарывы ў гаспадарцы наглыбляліся, парт'ячэйка і рабфком нічога не ўжывалі для напярэджаньня і ліквідацыі гэтых прарываў, а заставаліся ў ролі апартуністычных наглядальнікаў.

Ніякай масавай палітасьветнай работы ў саўгасе не праводзілася. Пытаньням правільнай арганізацыі працы, пытаньням узмацненьня працоўнай дысцыпліны, шляхам разгортваньня сацыяспаборніцтва і ўдарніцтва ні рабфком, ні рабфком не займаліся. Парт'ячэйка ня спрыяла разгортваньню пралетарскай самакрытыкі, як важнейшага сродку ў змаганьні супроць апартуністы і вышчэньні ўсіх нездаровых зьяўлеч, якія мелі месца ў саўгасе.

Нарэшце, становішчам саўгасу і работай ячэйкі зацікавіўся Багомльскі райком. Райком выявіў карэньні ўсіх прарываў у рабоце, выявіў з работы апартуністаў, паставіўшы на чале кіраўніцтва работнікаў, адданых выразна праводзіць у сваёй рабоце дырэктывы партыі. Гэта мерапрыемства ўнесла карэнны пералом у работу саўгасу. Усе недахопы ўзяты пад абстрэл самакрытыкі, рэгулярна выпускаецца насьценгазэта. Узьнялася творчая актыўнасьць рабочых мас. Сярод груп рабочых розных галін працы разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва. Створана ўдарная брыгада цыркулярчыкаў, брыгада калавых рабочых і сьвінароў. Многія рабочыя саўгасу ўзялі на сябе абавязак не пакідаць прадпрыемства да канца пяцігодкі. Рабочыя ўносяць шмат прапаноў для паляпшэньня гаспадаркі.

Зараз сканцэнтравана ўся ўвага рабочых на падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Работа ў гэтым напрамку ў поўным ходзе.

ЧАРКАСАЎ.

Навейшыя антысавецкія „происки“ яўрэйскага клерыкалізму

Яшчэ Маркс гаварыў, што «рэлігійныя пытаньні маюць цяпер грамадзкае значэньне, аб рэлігійных інтарэсах, як такавых, ня можа быць цяпер больш гутаркі, толькі тэолёг можа яшчэ думаць, што справа ідзе аб рэлігіі, як такавой». У сучасны момант «грамадзкае значэньне», клясавы характар рэлігіі вельмі рэзка выпуклен, апошні перыяд абвостраная антысавецкая кампанія міжнароднага клерыкальнага фронту асабліва агалі «грамадзкую ролю» рэлігіі і клерыкалізму ў такой ступені, што паўрад які-небудзь тэолёг возьме на сябе ролю даказаць існаваньне «рэлігіі, як такавой». Яўрэйская рэлігія, яўрэйскі клерыкалізм у даным выпадку зьяўляецца пацьвярджэньнем агульнага правіла.

Вось некалькі фактаў, якія мелі месца за апошні час. У Менску выкрыта, што яўрэйскае пахавальнае таварыства, якое зьяўляецца непасрэдным адгалінаваньнем яўрэйскай рэлігійнай абшчыны, абшчыны, у якой засядаюць і пад пыльдай якой робяць свае справы спэкулянты, наманы і махровыя клерыкалы,—яўрэйскае пахавальнае таварыства ўзяло пад сваю апеку яўрэйскія могілкі і такім чынам забясьпечыла за яўрэйскай рэлігійнай абшчынай калі ня жывыя масы яўрэйскага насельніцтва, дык зроблена, зразумела, ня з гэта было зроблена, зразумела, ня з мэтай ўзьдзейнасьці і ўплыву на ўпюўных на той сьвет яўрэяў. Гэта мерапрыемства—арэнда яўрэйскіх могілак,—было прадпрынята ў мэтах матар'яльнаадчувальных для жывых—у мэтах вядомага «грамадзкага націску» на нашай грэшнай зямлі. Ці-ж ня ясна, што клерыкалы, якія ўзялі сабе ў арэнду яўрэйскія могілкі, мелі на мэце прыбытак, мелі на мэце матар'яльнае забясьпячэньне сваёй зграі, прасьледвалі ўзмацненьне сваіх пазыцый сярод адсталых пластоў яўрэйскага насельніцтва.

Наступны факт. У Менску клерыкальным служкай Радунскім быў зроблен рытуал абразаньня над нованароджаным дзіцем яўрэйскага рабочага—будаўніка Чартока, паводле заявы бацькі—без яго ведама. На другі дзень пасьля абразаньня дзіця памерла ад крывавыліяньня. Пры абразае прысутнічаў рабін, прадстаўнік сынагогі і яўрэйскіх могілак. Гэты факт трубейшага гвалту, вытваронае акту сярэднявяковага звычаю, наперакор волі бацькоў—не зьяўляецца адзінкавым. Гвалтоўнае вытварэньне гэтага абраду прадстаўляе сабою частае зьявішча,—частае паколькі гэты абрад наогул мае месца сярод адсталых і няздольных даць адпор клерыкалам пластоў яўрэйскага насельніцтва. Пры дапамозе сваіх шчупальцаў, праз сынагогі і малінцьвенія дамы, клерыкалы маюць яшчэ магчымасьць пастаянна знаходзіць ў кантакце з іх прыхільнікамі, праз іх атрымліваць весткі аб нованароджаных, аб характары бацькоў і такім чынам рабіць свае справы, іншы раз, як мы бачылі, супроць волі бацькоў.

І, нарэшце, яшчэ адзін характэрны факт, які меў месца за апошні час. У адным з малінцьвеных дамоў гор. Полацку знойдзен «закрыты разьмеркавальнік» клерыкалаў, арганізаваны напярэдадні падрыхтоўчай кампаніі да яўрэйскага вялікадня. Ясна. Для вядзеньня гэтай многагабіцаючай справы яўрэйскія клерыкалы найшлі ў саюз з групай гандляроў: Залкіндам, Ізраэлітам і інш. Тыя «закрыты разьмеркавальнік» клерыкалаў устанавіў сувязь з супрацоўнікамі каапэрацыйнага складу Ліўшыцам і Розманам, апошнія забясьпечвалі клерыкальны «разьмеркавальнік» нішанічай мукой. «Разьмеркавальнік» таксама наладзіў сувязі з некаторымі каапэрацыйнымі работнікамі раёну, якія дастаўлялі дэфіцытны тавар.

Карэспандэнт газэты «Акцябр» расказвае наступнае аб гэтым «разьмеркавальніку»: «Сынагога пачала ажыўляцца. Кожны вечар тут зьбіраюцца былыя людзі... І вось скончана вячэрняя малітва, служка б'е на амбоне. «Клерыкальны разьмеркавальнік» пачынае сваю работу. Галоўным прыказчыкам зьяўляецца Залке гобай і ён накладае рэзалюцыі: гэтаму пуд пшанічнай мукі, таму паўпуда... трэцяму дзесяць фунтаў... па цане 80 руб. за пуд. Рабін пры гэтым дае свой подпіс, што «мука кашэрная на вялікдзень»... І ня толькі мука: тут можна было атрымаць мяса, гусіну, шмалец, цукар, тытунь... «Вось чым займаўся «клерыкальны разьмеркавальнік»! Але ўсяму, як гаворыцца ў байцы, прыходзіць канец. І вось гэтым «закрытым разьмеркавальнікам зацікавілася адпаведная ўстанова і аказалася, што апарат правяшту да вялікадня было знойдзена ў аднаго «актывіста» гэтага разьмеркавальніка 1, 343 даляры, а ў другога «актывіста»—розныя каштоўныя рэчы на суму 10,000 руб. і г. д.

Гэтыя факты, зразумела, ня вычэрпваюць дзейнасьць клерыкалаў у сучасны момант. Яўрэйскі клерыкалізм асабліва актывізуецца ў мястэчку, і тут вельмі часта яму аказвае дапамогу апартунізм, недаацэнка антырэлігійнай работы сярод яўрэйскіх працоўных мас. Сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце, барацьба партыі і савецкай улады за рэканструкцыю, пасьпяховае цэльную калектывізацыю, пасьпяховае правядзеньне палітычна-гаспадарчых кампаній у вёсцы, ня гледзячы на шаманаў, наступленьне на рэшткі капіталізму і ліквідацыя кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі, пасьпяховае правядзеньне культурнага будаўніцтва—усё гэта ня можа ня выклікаць актывізацыю ўсіх ворагаў савецкай улады, сярод якіх клерыкалізм і рэлігія займаюць начэснае месца, асабліва ў адсталым мястэчку і вёсцы.

Прыведзеныя асобныя факты яркa малюць нам палітычны характар, клясавае «грамадзкае значэньне» тэй дзейнасьці, якая разьвіваецца яўрэйскім клерыкалізмам. Але-ж і малому ясна, што ўсе гэтыя «справы», аб якіх ішла гутарка вышэй, зьяўляюцца адкрытым находам супроць савецкай улады, адкрытым гвалтам над воляй і сьвядомасьцю рабочых мас, грубым парушэньнем савецкага законадаўства, грубай абаронай інтарэсаў буржуазіі, самым шырокрытым саюзам паміж рэлігіяй з рэшткамі капіталізму, у мэтах падрыву пралетарскай дыктатуры.

Ня прыходзіцца тут даводзіць аб ролі клерыкалізму і яго «заслугах» у справе распаўсюджаньня нацыяналістычных і шавіністычных настроў. Шавінізм ёсьць адна з вострых зброй буржуазіі і клеру наогул, у тым ліку яўрэйскай буржуазіі і яўрэйскага клерыкалізму ў барацьбе за свой уплыў на працоўныя масы насельніцтва. Мы мелі факты, калі ў сувязі з пастановамі савецкай улады БССР аб правядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня, яўрэйскія клерыкалы павялі агітацыю, што гэта мера ёсьць наход супроць яўрэйскай дзетвары, бо гэта значыць гвалтоўнае абеларусізаваньне і галтоўнае ўцягваньне дзяцей яўрэйскіх веруючых у атэістычныя школы. Клерыкалы прабавалі скарыстаць гэты момант для агітацыі за яўрэйскую рэлігійную школу (хедар). Адной з магутных зброй шавінізму сярод яўрэйскага насельніцтва ў Польшчы і яўрэйскага клерыкалізму лічаць сьвята вялікдня, сьвята, у якім асабліва падкрэсьліваецца «абраньсьць» яўрэйскага народу і г. д.

Няма чаго ўжо даводзіць, што сваю кампанію за сьвяткаваньне вялікдня і іншых рэлігійных сьвят, клерыкалізм скарыстоўвае для агітацыі супроць пяцігодкі і супроць бесьпераньнікі для арыгу рабочых дзён. Пад маскай рэлігіі яўрэйскі клерыкалізм дапамагае антысавецкаму фронту ў яго барацьбе супроць СССР, у яго падрыхтоўцы да інтэрвэнцыі.

Трэба асобна спыніцца на ролі яўрэйскіх клерыкалаў у падрыхтоўцы да інтэрвэнцыі і ў паходзе міжнароднага клерыкалізму супроць Савецкага Саюзу. Яўрэйскія шавіністы, маскуючыся ў «левыя» фразы, абараняюць яўрэйскіх клерыкалаў і ворагаў савецкай улады, заяўляючы, што «сярод яўрэяў няма супрацілыкаў камунізму», што «ўсе яўрэі за савецкую ўладу». Гэта — адна з аднак яўрэйскага шавінізму, якая заключаецца ў поглядзе на яўрэйскі народ, як на нешта цэлае. Аднак, варта толькі зьвярнуць увагу на ролю яўрэйскага клерыкалізму і ўнутры ў нас (гл. вышэйпрыведзеныя факты) і па-за СССР, каб

За пабудову самай перадавой у сьвеце сельскай гаспадаркі

Асноўныя задачы калгаснага зьезду

Сёньня адкрываецца 3-ці Усебеларускі зьезд калгасаў. Мінулы перыяд ад 2-га да 3-га зьезду калгасаў (кастрычнік 1928 г.—сакавік 1931 году) характарызуецца вялізарнымі посьпехамі на сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

За гэты перыяд адбыўся гістарычнага значэньня паварот мільённых бяднякоў-серадняцкіх мас на шлях сацыялізму. Шырокія бяднякова-серадняцкія масы, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пры дапамозе пралетарскай дзяржавы, знайшлі адзіны правільны шлях перабудовы сельскай гаспадаркі і палепшэньня свайго матар'яльнага становішча шляхам калектывізацыі, шляхам будаўніцтва сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Бяднякова-серадняцкія масы, на справе пераканаўшыся ў перавазе буйной гаспадаркі на прыкладах саўгасаў і калгасаў, рашуча і беспаваротна перавосабілі ад дробнай пяка-таварнай адасобленай гаспадаркі да буйной—калектыўнай.

За мінулы два з паловай гады лік калгасаў павялічыўся з 994 да 5.180, а колькасць калектывізаваных гаспадарак узрасла з 6.498 да 150.000. Тэмп калектывізацыі ўсё больш і больш нарастае. Бяднякова-серадняцкія масы канчаткова вырашаюць пытаньне за ка-го—за калгасы, ці супроць калгасаў?

Сёньня мы ўжо маем каля 10 раёнаў, якія пераўтварэнцца ў раёны суцэльнай калектывізацыі. Гэтыя факты паказваюць, што мы маем усе неабходныя, каб правядзеньне суцэльнай калектывізацыі і на ня падставе ліквідацыі кулацтва, як класу, скончыць у асноўным да канца пяцігодкі.

Мы дабіліся на толькі росту калгасаў, а таксама вялікіх посьпехаў у арганізацыі калектыўнай вытворчасьці. Ураджайнасьць у калгасах вышэй ураджайнасьці адасобленых гаспадарак, у калгасах больш прадукцыйна выкарыстоўваецца цягавая сіла і інвэнтар, у калгасах значна вышэй таварнасьць прадукцыі. Адсюль і лепшае матар'яльнае становішча калгаснікаў у параўнаньні з адасобленымі бяднякова-серадняцкімі гаспадаркамі.

Практыка калгаснага будаўніцтва і арганізацыя саўгасаў палкам і поўнасцю пераканала працоўных правых апартуністаў аб тым, што калгасы і саўгасы ня могуць вырашыць абожжаючай праблемы, ня могуць даць нам патрэбай колькасьці таварнай прадукцыі.

Практыка разьбіла бухарынскую тэорыю, аб тым, што саўгасы і калгасы могуць даць неабходную колькасьць таварнага хлеба толькі праз 5-10 год, а нам патрэбен хлеб зараз і таму ня варта ўрэзацца кулаку. Партыя адкінула такога роду прарочэтвы. Партыя няўхільна вяла лінію партыі на індустрыялізацыі, палітыку разгортвання наступленьня на капіталістычныя элементы і ліквідацыю кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі і ўжо ў другім годзе пяцігодкі забясьпечыла наступленьне звыш 50 проц. усяго таварнага хлеба ад саўгасаў і калгасаў, што ў лічбах пакрывае ўсю таварную прадукцыю кулацкіх гаспадарак.

Калгасы БССР пры пазначэньні ўдзельнай вагі ў пасеўных плошчах у мінулым 1930 годзе далі (прадалі) дзяржаве звыш 27 проц. усяго таварнага хлеба.

Арганізацыя саўгасаў і калгасаў дала магчымасьць у асноўным вырашыць абазначаную праблему, дзякуючы чаму партыя змагла шчыльна падысьці да вырашэньня мясной і тлушчовай праблемы. У гэтай галіне партыя ўжо таксама дасягнула значных посьпехаў. У спэцыялізаваных калгасах БССР, у таварных малочных формах пастаўлена звыш 40.000 шт. прадукцыйнай жывёлы. У сьвінагадоўчых калгасах пастаўлена звыш 35.000 сьвіна-матак. Удойлівасьць малочнага стада ў малочна-таварных формах ужо вышэй удойлівасьці адасобленых гаспадарак. Сярэдні ўдой адной кароўы ў малочна-таварных фермах у мінулым годзе склаў 14,3 цн. супроць 9,2 у адасобленых гаспадарках.

Сьвінагадоўчыя калгасы паступовa пачынаюць ужо даваць таварную прадукцыю. За першы квартал гэтага году калгасы далі (прадалі) звыш 2.000 адкормленых сьвіней.

Гэтыя вынікі працы калгасаў паказваюць сёньняшняму яшчэ адасобленку і дамагаюць яму канчаткова вырашыць пытаньне, на якім шляху ісьці—па шляху калектывізацыі, ці заставацца ў сваёй адасобленай гаспадарцы. Шырокія бяднякова-серадняцкія масы пад уплывам посьпехаў калгаснага будаўніцтва з кожным днём усё больш і больш становяцца на шлях калектывізацыі, на шлях сацыялізму.

Гэтыя пістарычнага значэньня посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі дасягнуты дзякуючы правільнай генэральнай лініі камуністычнай партыі на індустрыялізацыі краіны, якая вяла ўпорна асноваю ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя посьпехі забясьпечаны рашучай барацьбой з ухілам ад генэральнай лініі партыі, з правым апартунізмам—агентурай кулацтва ўнутры партыі,—сляпакімі загібамі і прымірэнчымі адносінамі да розных ухілаў, рашучым наступленьнем на капіталістычныя элементы, бязьлітасным змаганьнем з антысавецкімі элементамі, шкоднікамі, контр-рэвалюцыянерамі беларускім нацыянал-дэмакратызмам і іншымі шавіністамі. Гэтыя посьпехі—вынік таго, што рабочая клясна правільна ажыцьцяўляла і ажыцьцяўляе задачу ўмацаваньня саюзу з бяднякова-серадняцкімі масамі сялянства.

Партыя на справе забясьпечыла сапраўдную вытворчую змычку паміж рабочай клясай і бяднякова-серадняцкімі масамі сялянства. Надухільнае праведзеньне лініі партыі на індустрыялізацыю краіны дало магчымасьць з кожным годам павялічваць вытворчую дапамогу сельскай гаспадарцы з боку сацыялістычнай прамысловасьці. Толькі за апошнія два гады пралетарская дзяржава выдаткавала на дапамогу будаўніцтву калгасаў звыш 60.000.000 руб. крэдыту. Ужо ў гэтым годзе на палёх БССР будзе працаваць 23 МТС—гэтых апорных пунктаў сацыяльнай калектывізацыі і арганізацыі высока-таварных калгасных гаспадарак.

Аднак, дасягнутыя посьпехі яшчэ ня ўна недастатковыя. У рабоце па калектывізацыі, у арганізацыі калектыўнай вытворчасьці мы маем яшчэ вельмі многа недахопаў. Тэмп калектывізацыі яўна невыстарчальны. Правапартуністычная стаўка на самацёк у рабоце раду арганізацый, у тым ліку і раённых калгасасаюзаў, яшчэ не ліквідавана і зараз. Рад райкалгасасаюзаў не стаць на чале калгаснага прыліву і не пасьпяваюць за ініцыятыўнай мас. Ёсьць такія раёны, дзе новыя калгасы не афармляюцца на працягу доўгага часу (Лепель, Рагачоў, Чаўсы і інш.). Такая практыка стрымлівае ініцыятыву бяднякова-серадняцкіх мас.

Асноўным недахопам раду калгасаў выяўляецца нездавальняючая арганізацыя працы. Зьдольныя нормы выпрацоўкі, ударніцтва і сацыяборніцтва, вельмі слаба распаўсюджаны. У мінулым годзе толькі каля 40 проц. калгасаў мелі нормы выпрацоўкі. Частка калгасаў, падаўшыся кулацкай агітацыі, правяла ў сябе няправільнае антыкалгаснае разьмеркаваньне прыбыткаў і ўраджаю на на прынцыпе колькасьці і якасьці затрачанай працы, а па ядоцкім прынцыпе. Такі прынцып разьмеркаваньня не замацоўвае калгаснай гаспадаркі, ня ўзьнімае прадукцыйнасьці працы ў калгасах, я вядзе да безгаспадарчасьці, да разбазарваньня таварнай прадукцыі, дае магчымасьць гультаёў і прагульшчыкам жыць за лік перадавых, адданых справе калектывізацыі калгаснікаў.

Толькі няправільная арганізацыя працы, адсутнасьць выдзельных норм выпрацоўкі і правільнае разьмеркаваньне прыбыткаў і ўраджаю выклікала прычыны таго, што рад калгасаў несвайчасова спраўляецца з гаспадарчымі заданьнямі.

Задача хутчэйшага ўзьцяльця таварнасьці ў калгасах і правільнай арганізацыі вытворчасьці патрабуе безадкладнага пераходу на вядзьмічную і планавую работу.

Толькі прынцып разьмеркаваньня даходу і ўраджайнасьці на колькасьці і якасьці затрачанай кожным калгаснікам працы і рашучая барацьба з ядоцкімі прынцыпамі, забясьпечваюць правільную арганізацыю гаспадарак, даюць магчымасьць правільна выкарыстаць рабочую сілу і дасягнуць высокіх якасных паказальнікаў калектыўнай вытворчасьці.

Асноўным недахопам кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам зьяўляецца тое, што калгасны апарат, пачынаючы зьверху і канчаючы праўленьнем калгасу, задачу арганізацыі вытворчасьці не пастаўлену ў цэнтр сваёй увагі, што ў адпаведнасьці з гэтым не перабудаваў сваёй работы. Прычынай гэтага ў значная ступені зьяўляецца тое, што калгасны апарат засьмечан права-апартуністычнымі і шкоднікамі элементамі, якія сьвядома імкнуцца зрываць і перашкаджаць узмацненьню тэмпаў калектывізацыі і арганізацыі калектыўнай вытворчасьці.

Зьезд будзе працаваць у парыяд, калі надыходзіць практычная работа на правядзеньні другой бальшавіцкай вясны, на ўмовах, калі яшчэ ня ўсё, што паміна забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне весьнавой сяўбы, падрыхтавана. Тэмпы падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы на сёньні дзень яшчэ недазьмяшчэнны. Задача зьезду—падагуліць двухгадовы вопыт работы, высьвятліўшы лепшую практыку па арганізацыі калектыўнай вытворчасьці і правядзеньні калектывізацыі, а бальшавіцкай рашучасьцю ліквідуючы усе недахопы, распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі ўзмацненьне тэмпаў калектывізацыі, правільную арганізацыю калектыўнай вытворчасьці.

Асноўным стрыжанем работы зьезду павінна зьявіцца ўзмацненьне тэмпаў калектывізацыі, правільная арганізацыя працы ў калгасах, правільнае разьмеркаваньне прыбыткаў і ўраджаю, падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны і рашучае палепшэньне работы ўсёй калгаснай сыстэмы.

МІЦЬКОЎ.

Калгасы асноўная крыніца рабочай сілы для сацыялістычнай прамысловасьці

Ліквідацыя беспрацоўя ў горадзе і вялізарныя задачы на будаўніцтве, якое памячаецца ў трэцім годзе пяцігодкі, ставяць перад намі ў усёй вострасьцю задачу па забясьпячэньні сацыялістычнай прамысловасьці і саўгасаў рабочай сілай.

Для таго, каб задаволіць сэзонныя і пастаянныя патрэбы народнай гаспадаркі СССР, толькі ў 1931 годзе патрэбна 11 млн. чалавек. Зразумела, з далейшым ростам індустрыялізацыі краіны патрэбы на рабочую сілу будуць узрастаць.

Ясна, што асноўнай крыніцай, адкуль можна атрымаць такую колькасьць новых кадраў для прамысловасьці, вызначэньня вёска і ў першую чаргу калгасы. **У гэтым годзе перад калгаснай сыстэмай упяршыню паўстае вялізарная палітычная задача—арганізавана забясьпечыць сэзонныя галіны народнае гаспадаркі патрэбнай працоўнай і цягавай сілай.**

Згодна праектовачных кантрольных лічбаў на 1931 год Наркампрацы і Калгасцэнтру СССР, калгасы БССР павінны вылучыць на сэзонныя работы ў прамысловасьць 55.500 чалавек, у тым ліку: на будаўніцтва—7.400, лесазагатоўкі—19.700, сплаў—10.500, нагрузачныя работы—500, у саўгасы—9.400, торфараспрацоўкі—3.800 і інш.—4.200 чал.

Гэтыя арыентовачныя кантрольныя лічбы ёсьць цьвердае заданьне, якое ні ў якім разе не павінна быць зьніжана. Мала гэтага, калгасы павінны дабіцца перавыкананьня гэтага заданьня.

Посьпех вярбоўкі можа быць дасягнуты толькі тады, калі гэта работа будзе праведзена своечасова, арганізаваным парадкам і на аснове дагавораў, якія заключаюцца органамі працы, або гаспадарчымі органамі з праўленьнямі калгасаў.

Таму вельмі важна, каб Калгасцэнтр, разам з НКПрацы, неадкладна ўдакладніў арыентовачныя кантрольныя лічбы і спусьціў іх у раёны—на райкалгасасаюзах в тым, каб апошні разам з раённымі органамі працы,—на аснове кантрольных лічбаў і в улікам вытворчых заданьняў пасобных калгасаў тэрмінова ўстанавілі, якімі калгасамі і ў якой колькасьці будзе вылучана рабочая і гужавая сіла ў 1931 годзе, в разьбіўкай—для якіх работ і на якія тэрміны.

Як правіла, кожны калгас павінен вылучаць рабочую і гужавую сілу толькі для адной гаспадарчай арганізацыі. Выключэньне можна дапускаць толькі ў тых выпадках, калі вылучаная рабочая сіла калгасу ня можа быць выкарыстана адной гаспадарчай арганізацыяй.

Пры складаньні плянаў калгасы павінны ўлічыць необходнасьць ажыцьцяўленьня гаспадарчых мерапрыемстваў (арганізацыя працы ўнутры калгасу, павышэньне прадукцыйнасьці працы і ўзмацненьне працэсыцыліны, правільная расстаноўка рабочай сілы і г. д.); практыкаваць ужываньне жаночай працы на ўсіх работах там, дзе гэта магчыма, каб поўнасьцю забясьпечыць адыходніцтва калгаснікаў у разьмерах, прадугледжаных плянам райкалгасасаюзу.

Райкалгасасаюзы, праўленьні калгасаў і раённыя органы працы, у сувязі з пасылкай калгаснікаў на вытворчасьць, павінны неадкладна разагрэць сярод калгаснікаў масавую і растлумачальную работу. Арганізаваць у калгасах камісіі садзейнасьці па арганізацыі адыходніцтва в калгасаў. Кулацтву, якое будзе прымаць усе меры да зрыву адыходніцтва з калгасаў і тым самым будзе імкнуцца сарваць забясьпячэньне прамысловасьці рабочай сілай, і апартуністычнай стаўцы на самацёк, і недазацэнцы адыходніцтва, імкненьню затрымаць, забараніць адыход, матывуючы гэта рознымі „аб'ектыўнымі" прычынамі—павінен быць дан самы рашучы адпор.

Калгасы, зьяўляючыя сапраўднай апорай савецкай улады на вёсцы, павінны прыняць актыўны ўдзел у індустрыялізацыі краіны шляхам павышэньня ліпкасьці сваёй рабсілы ў прамысловасьць. Гэтым самым яны на справе дапамогуць выкананьню пяцігодкі за чатыры гады.

С. К-ў.

Некаторыя ўрокі разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах

За мінулы год калгаснае будаўніцтва ў БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мае вялізарныя посьпехі. Існуючыя калгасы на справе паказалі перавагі калектыўнай гаспадаркі перад дробнай адасобнай. Прадукцыя калгасаў ужо ў 1930 годзе ня толькі замяніла прадукцыю кулацкіх гаспадарак, але значна перакрывае яе.

Дзесяткі і сотні тысяч сялян беднякоў і сераднякоў на вопыце ўпэўніліся ў перавагах калектыўнай гаспадаркі. Вось чаму на сёньнішні дзень амаль ⅓ частка ўсіх бяднякова-серадняцкіх гаспадарак Савецкай Беларусі аб'яднана ў калгасы.

Але разам з вялізарнымі дасягненьнямі на фронце калгаснага будаўніцтва і добрымі вынікамі разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў у калгасах, мы маем у частцы раёнаў і калгасаў рад недахопаў і памылак у справе разьмеркаваньня прыбыткаў.

У радзе раёнаў партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі недазацанілі вялізарнага палітычна-гаспадарчага значэньня правільнага разьмеркаваньня прыбыткаў, недазацанілі асаблівую ролю разьмеркаваньня даходаў у справе замацаваньня калгасаў, палянцыя прадукцыйнасьці працы і працоўнай дысцыпліны, далейшага росту калектыўнай гаспадаркі. Разьмеркаваньне прыбыткаў у частцы раёнаў праводзілася „клабінэтным" парадкам і са значным спазьненьнем. Вынікі разьмеркаваньня ня былі шырока папулярызаваны як сярод калгаснікаў, так і сярод паўкольных адасобленых бяднякова-серадняцкіх мас.

Некаторыя раённыя калгасныя органы ненастарчальна кіравалі разьмеркаваньнем прыбыткаў у калгасах, прытрымліваючыся правапартуністычнай стаўкі на самацёк. У выніку не на ўсіх калгасах былі захаваны ўстаноўленыя партыяй і ўрадам прынцыпы разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў па колькасьці і якасьці затрачанай працы. Асноўныя скажэньні і памылкі, дапушчаныя ў частцы калгасаў, наступныя:

Зусім не разьмеркавалі ўраджаю і прыбыткаў, а ўстанавілі цьвёрдую зарплату калгаснікам. Напрыклад, калгас «Новы шлях», Чырвона-Слабодзкага раёну, выплачваў калгаснікам цьвёрдую зарплату, а рашту прыбыткаў—22.000 руб., якая павінна была быць разьмеркавана паміж калгаснікамі, перадаў у непадзельны капітал.

Прыбытні і ўраджай разьмяркоўваліся наадвалкі і патрэбнасьцям, на неўпэўных нормах спажываньня, незалежна ад таго, колькі і як працаваў калгаснік.

Авансы калгаснікам на працяку ўсяго году выдаваліся неадпаведна затрачанай працы, а на едакох. Гэтыя авансы па патрэбнасьці давараліся нават і тым калгаснікам, якія зусім не працавалі ў калгасе.

Не ва ўсіх калгасах выкананы дырэктывы аб адлічэньні 5 проц. з валавога ўраджаю і прыбыткаў на абагульненых калгаснікамі кароў для разьмеркаваньня паміж калгаснікамі адпаведна кошту абагуленай імі маемасьці.

Былі выпадкі разьмеркаваньня ўраджаю выключна ў перавазе на гроші. Натуральная-ж частка ўраджаю заставалася ў калгасе і выдаецца калгаснікам як аванс (паёк) у лік іх працы за 1931 год.

У Чырвона-Слабодзкім раёне раённыя работнікі не зразумелі сутнасьці калгаснай гаспадаркі—не зразумелі розьніцы паміж калгасам і саўгасам. У Чырвонай Слабадзе забылі аб асноўным прынцыпе разьмеркаваньня, які заключаецца ў тым, што рэальныя прыбытні гаспадарчага году пасьля вылічэньня і выдаткаў на далейшае зацаканьне і пашырэньне гаспадаркі (пасенфонды, карманы фонд, адлічэньні ў непадзельны і прамадзкія фонды і г. д.) падзяляюцца паміж калгаснікамі выключна ў адпаведнасьці з колькасьцю і якасьцю затрачанай працы, што прыбытні пасобных калгаснікаў залежаць выключна ад прыбыткаў усяе гаспадаркі.

Якія-ж канкрэтна памылкі былі зроблены ў Чырвона-Слабодзкім раёне?

Да прыбыткаў калгасу, якія павінны быць разьмеркаваны паміж калгаснікамі ў гэтым годзе, былі аднесены ўкладаньні ў гаспадарку калгасу, напрыклад, прыплод і прырост жывёлы. Такім чынам, рэальныя прыбытні, якія падлягаюць разьмеркаваньню, былі ў частцы калгасаў значна перабышаны. Разьмяркоўваюцца фактычна ўкладаньні ў асноўныя (капітальныя) фонды.

Праведзенае такім чынам разьмеркаваньне прыбыткаў паказала высокую эфэктыўнасьць прыбыткаў калгаснікаў, але-ж выплаціць калгаснікам гэтыя прыбытні калгас ня можа, бо яны перавышаюць рэальныя прыбыткі. Зусім зразумела, што атрымаўся адмоўны эфэкт.

У калгаснікаў склалася думка, што яны атрымліваюць заработную плату і яны дабіваліся не атрыманьня, ня лічачыся з магчымасьцямі гаспадаркі і рэальнасьцю прыбыткаў. Адсюль і адсутнасьць зацікаўленасьці ў палянцыі гаспадаркі, павышэньні не таварнасьці. Разьвіліся спажывецкія тэндэнцыі, якія спрыялі кулаку ў яго агітацыі супроць калгаснага будаўніцтва.

Штучнае перавышэньне прыбыткаў зьявілася адной з галоўных прычын дрэннага фінансавага і гаспадарчага становішча часткі калгасаў Чырвона-Слабодзкага раёну; не праведзен канчатковы разьлік з калгаснікамі, не пагашана запазычанасьць па крэдытах мінулых гадоў, ня зроблены фактычна адлічэньні ў непадзельны і грамадзкія фонды. Амаль ні ў адным калгасе ня выканана дырэктыва аб разьмеркаваньні 5 проц. валавога ўраджаю і прыбыткаў сярод калгаснікаў, якія абагулілі маемасьць. Такім чынам у часе разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў у калгасах забыў, што гэтае разьмеркаваньне павінна даць ня толькі высокі прыбытак калгаснікам, але, галоўнае, замацаваць калектыўную гаспадарку, лепш арганізаваць калгасную вытворчасьць, каб у далейшым забясьпечыць яшчэ большую эфэктыўнасьць калектыўнай гаспадаркі і адсюль павялічэньне прыбыткаў калгаснікаў, палепшэньне іх матар'яльна-бытавога і культурнага становішча.

Дапусьціўшы такія памылкі, кіраўніцтва райкалгасасаюзу пазбавіла сябе магчымасьці ператварыць разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў у масавапалітычную кампанію, якая павінна была ўкараніць у масы калгаснікаў сацыялістычныя адносіны да калектыўнай гаспадаркі і калектыўнай працы, забясьпечыць падняцьце таварнасьці калгасаў, новы магутны прыліў.

Пленум Чырвона-Слабодзкага РК ВКП(б) дасім правільна адзначыў у сваёй пастанове, што гэтыя памылкі зьявіліся вынікам неразуменьня часткай раённага актыву палітыкі партыі ў калгасным будаўніцтве і правай практыкі праўленьняў райкалгасасаюзу.

Аналёгічныя памылкі былі дапушчаны і ў іншых раёнах і з боку некаторых работнікаў цэнтральных калгасных арганізацый.

Напрыклад, тав. Залескі (член праўленьня Калгасцэнтру) у сваёй брашуры «Улік работы і разьмеркаваньне прыбыткаў і ўраджаю ў калгасах» зусім правільна выказдае прынцып разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў у калгасах. Але-ж у оваіх практычных прыкладах ён робіць памылку, запісаўшы у прыбытак, які павінен быць разьмеркаваны паміж калгаснікамі, прыплод і прырост маладняка. Апрача таго, тав. Залескі зрабіў грубую памылку, калі адлёс да выдаткаў затраты, зробленыя за рахунак будучых гадоў, у лік бягучага. Гэта ўносіць блытаніну. Калі так рабіць, дык вынікі разьмеркаваньня ў канцы гаспадарчага году ўраджаю і прыбыткаў ні ў якім разе ня могуць быць дасканальнымі.

Усе памылкі мінулага году неабходна зараз-жа ўлічыць і рашуча іх у далейшым зжыць. Партыйныя арганізацыі, савецкія і калгасныя органы павінны прыняць усе меры, каб укараніць у масы калгаснікаў, аднаасобнікаў—бедняцкі і серадняцкі правільныя прынцыпы разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў, бо ад гэтага будзе залежаць далейшае ўзмацненьне існуючых калгасаў, узьнятьце прадукцыйнасьці працы і таварнасьці калгасаў, палепшэньне матар'яльнага і культурнага становішча калгаснікаў і далейшае разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва.

Неабходна выдаць масавую папулярную, даступную шырокім масам пітэратуру аб разьмеркаваньні прыбыткаў у калгасах, каб кожны калгаснік і аднаасобнік бядняк і серадняк правільна зразумелі сутнасьць калектыўнай гаспадаркі і прынцыпы разьмеркаваньня.

Гэтае пытаньне треба прапрацаваць на ўсіх калгасах, на сходах аднаасобнікаў, у гуртках і ў школах.

Усьведамленьне шырокімі масамі калгаснікаў і аднаасобнікаў прынцыпаў разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах зьявіцца моцным ударам на кулацкай агітацыі супроць калгасаў і калгаснага будаўніцтва.

І. КАГАНОВІЧ.

Два калгасы

Адзін — каля вялікай вёскі Зенькавічы, за 5 вёрст ад м. Узды, і носіць кудраватую назву «Іскры калектывізацыі», да рэчы сказаць, гэту назву наўрад ці хто і ведае, апрача хіба самога арганізатара гэтага калгасу — Івана Салаўя, які вылупіў першым з калгасу.

У гэтым калгасе грымяць прозьвішчы: Ліпай, Ланіцкія, Кастрыцкія, Колас, Козел і інш. Кожнае імя тыпізавалася ў працасе разьвіцьця данага калгасу і можа служыць сынонімам тэй ці іншай адмоўнай зьявы ў калгасным жыцьці ваогул.

Другі калгас «Першае мая»—таксама за 5 вёрст ад м. Узды і таксама ў суседзтве з вялікай вёскай — Сямёнавічы. У гэтым калгасе ёсьць праўленьне, рэвізійная камісія, ёсьць і старшыня — проста старшыня калгасу, але прозьвішчаў ня чуваць. Калі што-небудзь там сур'ёзна бывае патрэбна, то на сцэне зьяўляецца «пленум», «агульны сход», «брыгады», але да прозьвішчаў я так і не дабраўся. Памятаю, спытаеш у старшыні:

— Дазвольце, я як ваша прозьвішча?

— Які гэта, таварыш, мае адносіны да справы? Вы, таварыш, будзьце ласкавы, зьвярнеце лепш увагу на тое, што у нас грубых кармоў на тыдзень засталося, а райкалгасасаюз — нуль увагі. У райкалгасасаюза з-над носу саўгас Узьдзянка калгасную салому ў Ланіцкага бярэ, а наша калгасная жывёла—над пагрозай...

Калі не памыляюся, то раней старшынёю быў тут «25-тысячнік» Гразоўскі, якога адклікала партыя, а на яго месца быў выбран стары калгаснік — т. Прыемка.

— Што з сябе прадстаўляе калгас «Першае мая»?

— Як ён будаваўся і як жыве?

Паўтара года таму назад тут узьнікла проста калгасная група з 7-8 сем'яў. Зразумела, узьнікла на аснове растлумачальнай работы партыі і пры яе падтрыманьні стала арганізоўвацца ў калгас. Гарачы, але бесталковы каморнік, які афармляў землі калгасу, напалохаў усю вёску Сямёнавічы, адрэзаўшы для калгасу частку прыгумеьняў.

Ратуючы свае гародныя землі і прыгуменьні, уся вёска з 218 гаспадарак адразу запісалася ў калгас. Гэта яхраз супала з часам надрукаваньня артыкулу тав. Сталіна «Галавакружэньне ад посьпехаў». Вёска потым вазірнулася, убачыла магчымасьць землі свае абараніць, не ўваходзячы ў калгас, — хлынула назад. Засталося толькі 16 гаспадарак. Пасьля некаторага часу з гэтых 16 гаспадарак самімі калгаснікамі былі выгнаны яшчэ тры гаспадаркі, як ідэалёгічна і клясава чужыя. Засталося аднародное моцнае ядро з 13 гаспадарак.

Пасьля выпаньня трох падкулачнікаў, па-ленінску настроеная беднота больш рашуча пайшла да калгасу, а дыфэрэнцыяцыя вёскі стала пашпарацца і пагыбяцца: клясавыя розьнасьці акрэсьліліся ва ўсю.

Зараз у калгасе 40 гаспадарак, якія ўвайшлі грунтоўна, выконваюць усе плянавыя заданьні савецкай улады з поўнай грамадзкай сьвядомасьцю, ня лічачыся ні з якімі асабістымі затрудненьнямі. Пры гэтым яны ўвесь час вядуць вялікую растлумачальную работу з насельніцтвам, а ў апошні час, для работы па ўцягненьні аднаасобнікаў у калгасы яны вылучылі брыгаду з лепшых, найбольш палітычна падкаваных таварышоў.

Да весьнавой сяўбы ў калгасе «Першае мая» ва ўсім, што залежала ад іх, падрыхтаваліся на ўсе 100 проц. Калгас прымае нармальны ўдзел і ў выкананьні пляну несазагатовак. **Адізнае ня ўладжанае пытаньне — гэта недахват грубога корму для 40 штук буйной рагатай жывёлы.**

Здаецца, аб калгасе «Першае мая» і сказаць больш няма чаго... Але, калі ў поле калгаснікаў прыйшлося гутарыць аб увязцы ваных пасеўнага весьнавога пляну з умовамі іх поля і спачуваць, што да гэтага часу ў іх няма правільнага севазвароту, яны, амаль усе, з перакананасьцю мне запярэчылі:

— Нам яшчэ нельга аб правільным севазвароце думаць — рана: яшчэ арганізацыйны працэс грунтаваньня не закончыўся, сёньня ў нас 200, а ўвосень будзе 300, а ўвесну і 400 гэктараў.

Адзін упэўнены тон гэтых пярочаньняў варты таго, каб напісаць аб ім цэлую кнігу.

Янгіз: у старшыні, у пайцы, патрошку, але няўхільна, перад кожным пасяджэньнем зьяўляюцца заявы аб прыёме у калгас... І я ўжо ад сябе скажу, што гэтыя заявы даюцца на аснове жорсткай клясавай барацьбы, барацьбы глухой, упартай, бязьлітаснай, якая вядзецца з абодвух бакоў, па ўсіх правілах стратэгіі.

У Сямёнавічах вельмі моцны кулацкі ўплыў і ў наяўнасьці дэмаралізуючыя элементы. Прыклад: старшыня сельсавету Радзюк за п'янства і іншыя «художэства» выключан з партыі. За ім маса спагнаньняў была і ў мінулым, але ён яшчэ ня зьпят з работы. «Пакрыўджаны» райкомам, старшыня сельсавету Радзюк «помсьціцца». У дошку п'яны Радзюк, на вячорках філёсофствуе аб пяцігоддзі ў духу Каўцкага, а адсюль робіць вывады і аб калгасным будаўніцтве.

Цяпер аб «Іскры калектывізацыі», аб гэтай Іскры без агню. Яна ўзьнікла крыху інакш, чым «Першае мая».

Зьявіўся Іван Салавей. Нудна хлапку, рабіць яму тут няма чаго, а ён «хлапец сьвядомы», як ён рэкамэндуе сябе. Дай, думае, калгас хоць арганізую. Пачаў арганізоўваць. Камсамольцы, зразумела, у свае рады такога арганізатара прынялі, падтрымліваюць. Давёў Салавей арганізацыю калгасу да юрыдычнага канца. Пачалі абагульваць землі і прылады вытворства. Раптам — канфуз: родны бацька Салаўя ня хоча ў калгас.

— Ну, што-ж... — гаворыць камсамольцы, — ня падай духам: ведаем, што аднаго бацьку ўламаць цяжэй, чым цэлую вёску, справа ясная. Але ты адмяжуйся, адыдзі ад бацькі і працуй у калгасе.

Салавей-жа засьпяваў жаласьлівую песеньку.

— Таварышы, я голы... Мне зімой цяжка прыдзецца, калі я адмяжуся ад бацькоў... Мне-б зімой на службачку ў раён, да вясны...

Камсамольцы, з месца ў кар'ер, далі яму службачку на 40-50 рублёў. Сьвіснуў Салавей І... змоўк. Ён думаў, што ў раёне, убачыўшы яго арганізатарскія здольнасьці, камісарам яго зробяць, а тут — 40 рублёў... Узмахнуў Салавей крылкамі ды проста ў бацькаўскі дом... І ня зірнуў нават на «Іскру калектывізацыі». Ну, зразумела, выставілі яго і з камсамолу.

Умовы для арганізацыі калгасу «Іскра калектывізацыі» былі дасканалыя. 160 гэкт. царкоўнай ураджайнай зямлі. Заліўныя лугі на рэчцы Узьдзянцы; спрыяючыя адносіны да калгасу вялікай вёскі Зенькавічы.

Сорак з лішкам дварэў аб'ядналіся і пачалі працаваць давоі дружна.

Вылецеў Салавей, засталіся: **Ліпай** — кандыдат партыі, **Кастрыцкі** — бацька камуніста, старшыні Хатлянскага сельсавету; **Колас**—старшыня камітэту ўзаімадапамогі; **Ланіцкія** — ўладзьнікі самай буйнога паю ў калгасе, **Козел** — настаўнік з Зенькавіцкай школы і інш. Як бачыце, усе «асобы» ад матчынай утробы, прызначаныя для кіраўніцтва.

Суседзі сьмяюцца, што зенькавіцкі калгаснікам «кабан сьвіньню падкладжыў»... Сьвіньня тут сапраўды замяшалася побач з «асобамі», і трэба адлавіць ёй справядлівасьць, яна вельмі адкрыта выцягнула на вольнае паветра, на гназ свалачны мяшчанскі дух адных кулацка-эксплёататарскую натуру другіх, запранёл.

Справа была так. Засумаваў кабан. У раёне чума. Паранішы кабана закалоць. Гэту «адказную» работу даручылі Ланіцкаму і Коласу. Ланіцкі—член праўленьня, а Колас — член рэвізійнай камісіі. Калі асьвежаванага кабана ўнесьлі на двор не аказалася грудзінкі, пугпанасала і яшчэ сяк-такіх «дробязяй». І узяў сабе «буйны пайшчык» — Ланіцкі. Колас пварабаваў вярнуць. Ланіцкі сьцяўпны кулакі і зубы, падпарадкавацца. Але, калі сталі дзяліць кабана в едаках, то Ланіцкі надзяліў усіх сваіх сваякоў, якія і ў калгасе не працуюць, як напрыклад, яго брат, служачы лесапрамгасе, а Коласу і на старога бацьку ня даў ні грама. Рабіліся так са зноны старшыні Ліпая і іншых члена праўленьня.

Колас быў «абуран бязьмежна» І... вышаў з калгасу. Колас, як член рэвізійнай камісіі, не сабраў агульнага сходу пад'ёў бараньбы з рашэньнем Ланіцкага і натураньнем праўленьня і Ліпая, і проста, «як сумленны чалавек», адышоў ад зла. Не, таварыш Колас, самалюбіе індывідуалізм, спасаваў перад перэсілтываньнем асабістых нярпвільнасьцяй.

Сьледам за Коласам вышаў, на патрабаваньні сына-камуніста, Кастрыцкі, як карыстаўся навагай імённа таму, що зьяўляўся бацькай камуніста. І кулакі прыгнятальніцкім замашкам Ланіцкіх не хапіла межаў.

Ланіцкіх у калгасе 9 чал. і ўсе работнікі, але сям'я Ланіцкіх вялікая і на калгасам. Работнікі яны добрыя. І в гэтай падставе яны патрабуюць і ад усіх выключнага напружаньня ў рабоце. Яны гатовы імпануюць Ліпаю. Скоўцы, «тэхнік», «выканаўцы пляну»... робяць Ліпая безгалосым нават, калі праўленьне Ланіцкі на ўсіх крычыць, «яч той старпан», калі Ланіцкі тыча калгасьнікам зубы, калі абзывае іх «быдлам», «брыдогай» і «галотай» і абыходзіцца з іх, як з батракамі да рэвалюцыі.

У Ланіцкага ключы ад усёй калгаснай гаспадаркі, і распараджаецца ён нам Ланіцкі адмаўляцца. Ніхто не рэвізуе Ланіцкага, калі ён бяро корм для калгаснай жывёлы, калі для сваёй уладзьнікі або калі ён цягне з калгасу ў свой двор калгаснае дабро.

І гэты ланіцка-ліпаўскі прыгон стаўнерыны калгаснікам, і яны нікіну ў калгасе адных адміністратараў з Ланіцкім і Ліпаем на чале.

Зараз у калгасе ўсяго 7 гаспадарак 20 работнікамі, з якіх Ланіцкіх — 9 чалы 8 чал. адміністрацыі. За ўсё лета за ўсю зіму ня было ні адной заявы просьбай аб прыёме ў калгас. Дзьверы ў калгас зачынены.

«Ці ня пускаюць туды наўмысьне» і «самі ня ідуць» — гэта пытаньне ня куль толькі дыскусуецца. Але з бо-ведаць: што Ліпай, як партыец, быцьцо і засьвае, а Ланіцкі — фактычны гаспадар калгасу — цінком сьцюпчы кулак наказаво. Але факт: ніхто ня ідз

Апэрацыйныя зводкі барацьбы за прамфінплян

На штурм прарыву!

Блізка канец першага кварталу трэцяга году пяцігодкі

Ліквідаваць запазычанасьць першых двух месяцаў

Ударыць па апартуністычным самацёку!

Прычыны прарыву на Віцебскай акулярнай

Віцебская акулярная фабрыка мае вялікі прарыў у выкананьні прамфінпляну. За апошнюю пяцідзёнку (ад 5 па 10 сакавіка) праграма выканана толькі НА 67,03 ПРОЦ. Асабліва адстае шліфавальны цэх, які выканаў сваю праграму толькі на 35,8 проц.

Прычыны прарыву хаваюцца ў самой сыстэме кіраўніцтва фабрыкай. Прынцыпы адзіначальня не жыцьцяўлены. Нізавой цэхавай адміністрацыі ня даны правы дысцыплінарных спагнаньняў. ЦЭХІ ЎСЁ ЯШЧЭ НЕ ПЕРАЙШЛІ НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК. Прагулы па нагрунтоўных прычынах павялічваюцца (студзень даў 400 прагульных дзён). Зусім мала ўвагі аддаецца барацьбе з бракам. Шліфавальны цэх выпускае выключна прадукцыю другога і трэцяга гатунку і брак. Цэх можа працаваць значна лепш. Гэта відаць з таго, што адзін час, дзякуючы прынятым мерам, цэх даў 13 проц. прадукцыі першага гатунку, 62 проц. другога і рэшта — трэцяга гатунку. БРАКУ АМАЛЬ НЯ БЫЛО. Але адміністрацыя гэтыя мерапрыемствы НЕ ЗАМАЦАВАЛА, ня ўявіла іх у сыстэму, таму нікасьць зноў пагоршылася.

На фабрыцы да гэтага часу не ўпарадкаваны расцэнкі. Расцэнкі робяцца «на вока», без навуковага ўгрунтаваньня. Расцэнка на загібку кранштэйну складае 6 р. 50 к. За рабочы дзень можна зрабіць 4 кранштэйны. Такім чынам, заработак аднаго рабочага-кавяля складае 20-25 руб.

Аб безгаспадарчасьці сьведчыць такі факт: для розных машын зрабілі штампы, на якія патрацілі шмат грошай, матар'ялу і часу. Пасьля выявілася, што ЗАМЕСТ СТАЛЁВЫХ ШТАМПАЎ ЗРАБІЛІ ЖАЛЕЗНЫЯ.

Як заводзкія арганізацыі кіруюць ударніцтвам — можна ўбачыць з таго, што ПАСЬЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ІЛЖЭ-ЎДАРНАЙ БРЫГАДЫ, АБ ЯКОЙ НЯ РАЗ ПІСАЛАСЯ Ў ГАЗЭТАХ, НОВАЯ, САПРАЎДЫ ЎДАРНАЯ БРЫГАДА НЕ АРГАНІЗАВАНА. І таму мы маем такое становішча, што калі раней праграму выконвалі 67 ЧАЛ., дык цяпер 130 ЧАЛ. ПРАГРАМЫ НЯ ВЫКОНВАЮЦЬ.

Рабочыя фабрыкі зараз абвясьцілі ШТУРМ ПРАРЫВУ. Гэты штурм дасьць добрыя вынікі тады калі будзе разгорнута сапраўднае бальшавіцкае сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

А. ЗАРУБЕЖНЫ.

На новай фабрыцы па-старому

МАГІЛЕЎСКАЯ ШАЎКОВАЯ ФАБРЫКА ВЫКАНАЛА ЛЮТАЎСКУЮ ПРАГРАМУ НА 97 ПРОЦ. АДНАК, ПРАГРАМУ МОЖНА БЫЛО-Б ЛЕГКА ВЫКАНАЦЬ І НАВАТ ПЕРАВЫКАНАЦЬ, КАЛІ-Б СЯРОД РАБОЧЫХ ПРАВОДЗІЛАСЯ АДПАВЕДНАЯ РАБОТА. ФАБКОМ І ЦЭХКОМЫ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ПЕРАБУДАВАЛІ СВАЁЙ РАБОТЫ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З АПОШНІМІ ДЫРЭКТЫВАМІ ЎсеЦСПС. ФАБКОМ ПРАЦУЕ ПА-СТАРОМУ. СТАРШЫНЮ ФАБКОМУ ТАВ. ТОЛСТЫХ ВЕЛЬМІ РЭДКА МОЖНА ЎБАЧЫЦЬ У ЦЭХУ, СЯРОД РАБОЧЫХ. ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ НІЯКАЙ НЕ ПРАВОДЗІЦЦА, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ТОЕ, ШТО Ў ФАБКОМЕ ЕСЬЦЬ 3 ШЛАТНЫЯ РАБОТНІКІ.

ПРАМФІНПЛЯН НЕ ДАВЕДЗЕН ДА КОЖНАГА РАБОЧАГА, НАВАТ ДА КОЖНАЙ ГРУПЫ РАБОЧЫХ. УЛІКУ ЎДАРНІЦТВА НЯМА. ПРАГУЛЫ І СПАЗЬНЕНЬНІ НАБЫЛІ ПАГРАЖАЮЧЫ ХАРАКТАР. НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ПАТРАБАВАНЬНІ ФАБРЫЧНАЙ ГАЗЭТЫ «ЧЫРВОНАЕ ВЕРАЦЯНО», ФАБКОМ НЕ РАЗГАРНУЎ КАНКРЭТНАЙ БАРАЦЬБЫ З ПРАГУЛЬШЧЫКАМІ.

АСТАПАЎ.

Пэсін Гірш—прэміраваны ўдарнік гарбарні «Бальшавік». Працуе амаль ваз браку. Яго варштат, які ён вельмі ўважліва даглядае, ніколі ня мае няспраўнага стуку. «Гонар лашчыльнага аддзяленьня»—кажа пра яго загадчык цэхам.

Пакрыць запазычанасьць!

Цьвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік» (ст. Барань) у лютым выканаў праграму толькі на 51,8 проц. З прычыны перабою ў забесьпячэньні сгрэцом (дротам-катанкай), завод прымушан быў спыніць работу на 2 тыдні.

За першую дэкаду сакавіка завод выканаў праграму **на 32,8 проц.** Важна адзначыць, што ва вырабе **будаўнічых цьвікоў** завод перавыконвае праграму: за дэкаду выраблена 42,5 проц. месячнага пляну. Значна адстаюць цэхі па вырабе абойных цьвікоў (24.3 проц.) і галянтарэйны цэх (15,4 проц.).

Рабочы калектыў павінен ужыць рашучыя меры **для ліквідацыі запазычанасьці спачатку году.**

Напередадзе першая і пятая зьмены

Гута «КАМІНТЭРН» (Бабруйскі раён) у студзені выканала праграму на 74 проц. Прычыны невыкананьня праграмы наступныя: па-першае, не хапала сырцу, гута ў студзені мела значныя прастоі ў копыкасьці 228 варштатадзён; па-другое, не хапала кваліфікаванай рабочай сілы, гэта таксама выклікала 38 прастояў варштатаў.

У лютым вызначыўся пералом. Праграма ў адзінках выканана на 120 проц., па вазе — на 85 проц. Невыкананьне праграмы тлумачыцца тэхнічнымі прастоямі (18 варштатазьмен) і недахватам рабочай сілы (9 варштатазьмен).

Але за апошнія дні лютага і ў пачатку сакавіка тэмпы ўзмацніліся. Калі раней майстар рабіў 900 бутэлек, ён зараз робіць 1.700. За добрыя посьпехі ў выкананьні праграмы 2 зьмены — першая і пятая — атрымалі пераходны сьцяг імя парткалектыву і зоўкому.

Б. П. ШЭЎЧУК.



Тав. Гепяр—ударнік, рэйкаўшчык першага хромавага цэху гарбарні «Бальшавік». Вытворчы стаж—20 год. Яго варштат упрыгожан сьцяжком «За камуністычную працу».

Не прадугледзелі

Лютаўскую праграму мазырская фабрыка «Чырвоны Кастрычнік» выканала на 82,1 проц. Заданьне па выпуску экспартнай прадукцыі выканана на 53,2 проц. Побач з сапраўды аб'ектыўнымі прычынамі (напрыклад, спыненьне паравога катла на рамонт, сьнежныя заносы), ёсьць і рад суб'ектыўных прычын. Адміністрацыя не прадугледзела пуску лесазаводу «Пралетары», які 7 месяцаў знаходзіўся ў капітальным рамонце пасьля пажару. Рабочыя, якія раней працавалі на «Пралетары», пасьля пажару працавалі на «Чырвоным Кастрычніку». 20-га лютага гэтыя рабочыя перайшлі зноў на «Пралетары» і «Чырвоны Кастрычнік» аказаўся бяз поўнага штату рабочых. Прышлося спыніць частку варштатаў і машын другой і трэцяй зьмен. Віна за прастоі падае цалкам на адміністрацыю, якая не падрыхтавала адпаведнай рабочай сілы.

У адказ інтэрэсантам рабочы калектыў фабрыкі з вялікім энтузіязмам узяўся за ліквідацыю прарыву.

Л. М. ЯРАГОЛІН.

ТЭАТР

БДТ-2—НА НОВЫХ РЭЙКАХ

У гутарцы з нашым супрацоўнікам дырэктар БДТ-2 тав. ВОЛЬСКІ паведаміў наступнае:

— ЛЕТА Г. Г. БУДЗЕ НАМІ ВЫКАРЫСТАНА ДЛЯ ШЫРОКАГА АЗНАЙМЛЕНЬНЯ ПРАЦОЎНЫХ РСФСР З РАБОТАЙ НАШАГА ТЭАТРУ. БДТ-2 запрошан старшынёю галоўмастацтва РСФСР тав. ФЭЛІКСАМ КОНАМ для працы на чэрвень месяц у Маскве, у будынку МХАТ-2. Пасьля Масквы БДТ-2 будзе працаваць на працягу аднаго месяца ў ЛЕНІНГРАДЗЕ, у Выбаргскім і Маскоўска-Нарвскім Дамох культуры. У Ленінградзе рыхтуецца ўрачыстая сустрэча БДТ-2 з рабочымі буйных ленінградзкіх прадпрыемстваў пры ўдзеле беларускага Дому Асьветы ў Ленінградзе, фабрыкі Белдзяржкіно і беларускага сэктару Камакадэміі. Таксама прадстаіць гастролі тэатру ў СМАЛЕНСКУ.

Зараз тэатр працуе над прэм'ерай «КАЧАГАРЫ». Гэта п'еса напісана маладым беларускім пралетарскім драматургам тав. ГУРСКІМ на сучасным беларускім матар'яле. У ёй асьвятляецца кіруючая роля рабочае класы ў справе ператварэньня Беларусі з адсталай краіны ў краіну індустрыяльна-калгасную, барацьба з нац.-дэмакратызмам і г. д.

У гэтай пастаноўцы БДТ-2 зацьвярджае і разьвівае далей тыя прынцыпы, якія ім былі пакладзены ў рабоце над «Першай коннай». Гэта—рашучае выпучэньне мapplication ня і ўпор на дэтальную сцэнічную распрацоўку вобразаў рэвалюцыйнай масы. У гэтай пастаноўцы БДТ-2 шукае новых творчых мэтадаў перадачы, а таксама і новых мэтадаў вытворчасьці. У рабоце над гэтым паказам упяршыню будзе ўжывацца ПРЭМІРАВАНЬНЕ АКТОРАЎ за лепшае мастацкае стварэньне сцэнічных вобразаў з новых людзей — барацьбітоў і будаўнікоў сацыялізму.

СТВОРАН ШТАБ ВЫТВОРЧЫХ МАНЭЎРАЎ. Па афармленьні пастаноўкі працуе ў парадку сацспаборніцтва і ўдарніцтва некалькі акторскіх і тэхнічных брыгад. Таксама ўпяршыню ўжываецца масавая калектыўная работа актораў, рэжысуры і аўтара разам з прадстаўнікамі рабочага глядача. Для гэтага Ў РАБОТУ ТЭАТРУ ЎЦЯГВАЮЦЦА ДОБРААХВОТНЫЯ БРЫГАДЫ З КУЛЬТАКТЫВУ ЗАВОДАЎ: «ЭНЭРГІЯ», ЭЛЬВОД, «ДРЭВААПРАЦОЎЩЧЫК» І «БАЛЬШАВІК». Гэтыя брыгады ў якасьці кансультантаў прымаюць удзел у апрацоўцы пляну пастаноўні і асобных сцэн. Яны выказваюць свае думкі, ці правільна з іх пункту погляду аўтар, рэжысар і акторы трактуюць сцэны, ці жыцьцёвы і клясава-вытрыманы тыя ці іншыя вобразы, таксама як і ўсё афармленьне пастаноўкі.

АБ СВАЁЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ БРЫГАДЫ БУДУЦЬ РАБІЦЬ СПРАВАЗДАЧУ НА КУЛЬТАКТЫВЕ СВАЙГО ПРАДПРЫЕМСТВА І Ў ЗАВОДЗКІХ ШМАТТЫРАЖКАХ. Гэта ў сваю чаргу азнаёміць шырокія масы рабочых з вытворчай работай у тэатры. Аб усім гэтым заключан САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ДАГАВОР ПАМІЖ акторамі, рэжысурай, аўтарам і рабкорамі. Умова зацьверджана ЦСПСБ.

На такіх-жа падставах ствараецца БРЫГАДА СТУДЭНТАЎ КАМВУЗУ ІМЯ ЛЕНІНА. Гэта першы вопыт вынясьненьня тэатральнай творчай работы з вузкіх сьцен тэатру ў шырокія масы, з непасрэдным удзелам у пастаноўцы працоўнага глядача, першы на толькі для БДТ-2, але і наогул для ўсіх дзяржаўных тэатраў. Ён павінен даць цікавыя рэзультаты і паслужыць глебай для вывучэньня іншымі тэатрамі мэтадаўгіі агітацыйна-прапагандысцкай работы з глядачом унутры і вакол тэатру. У калідорах і фойе тэатру на тэму пастаноўкі будзе зроблена сіламі акторскага калектыву адпаведная выстаўка.

Тэхнічнай брыгадай праводзіцца плянавая рацыяналізатарская распрацоўка мерапрыемстваў па МАКСЫМАЛЬНЫМ ЗНІЖЭНЬНІ САБЕКОШТУ ПАСТАНОЎКІ.

Пастаноўка «Качагары» даручана маладому рэжысэру тав. МІЦКЕВІЧУ, выпучанаму з актораў БДТ-2. Музыку для пастаноўкі піша І. ГІТГАРЦ.

Акторскім калектывам БДТ-2 разгорнута шырокая грамадзкая работа па абслугоўваньні калгасаў і саўгасаў. СПЭЦЫЯЛЬНАЯ БРЫГАДА Ў СКЛАДЗЕ 19 ЧАЛАВЕК ВЫЯЖДЖАЕ ПА ВЫХАДНЫХ ДНЁХ У КАЛГАСЫ З П'ЕСАМІ «КАВАЛІ ЖЫЦЬЦЯ» і «КНЫР». Гэтыя пастаноўкі для вёскі пастаўлены акторамі добраахвотным парадкам за пік свайго вольнага часу. Таксама робяцца выезды на фабрыкі і заводы з інсцэніроўкай «На суд грамадзкі», накіраванай супроць пятунства і прагульніцтва і агітуючай за выкананьне фінпляну. Група актораў зьбірае па прадпрыемствах матэрыял для апрацоўкі і ўключэньня ў інсцэніроўку.

У сувязі з папаўненьнем складу тэатру маладымі супрацоўнікамі з ліку чпенаў рабочых драмгурткоў у БДТ-2 арганізаваны і пастаянна працуе свайго роду ТЭАТРАЛЬНЫ ФАБЗАВУЧ для навыцьця супрацоўнікамі сцэнічнай тэхнікі і тэатрытычных ведаў.

«Качагары» маркуецца выпусьціць у сярэдзіне красавіка.

С. К.

СЁНЬНЯ, 20 сакавіка, у 6 гадз. веч., у пам. рэдакцыі «Калгаснік Беларусі» адбудзецца

адкрыты агульны сход калектыву ЛКСМБ рэдакцый газэт.

Яўка камсамольцаў абавязкова.

КУЛАК САБАТУЕ ЗДАЧУ ІЛЬНУ

І прадае прадукцыю на рынку, карыстаючыся патураньнем мясцовых апартуністаў

Загатоўцы сядзяць на базах і не выяжджаюць на вёскі, спадзяючыся на самацёк

Мацней націск на кулака! Удар па апартуністах!

АЧЫСЬЦІЦЬ АПАРАТ АД АПАРТУНІСТАЎ

„Нам перашкаджаў раённы зьезд саветаў"

КЛІМАВІЧЫ. (Брыг. «Правды» і «Зьвязды»). На 10-е сакавіка плян ільназагатовак па раёне выкананы на 30,11 процантаў.

Месячнік штурму асабліва **зруху** ў загатоўках ня даў.

Раённыя арганізацыі працуюць у сьляпую, бяз «руля», бо ня маюць уліку здачы ільну паасобнымі групамі насельніцтва, бо ня маюць уліку выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі. Характэрна, што на 5-е лютага фігуравала лічба—28 проц. выкананьня пляну, на 15-е лютага—24(!), а на 1 сакавіка—зноў 28. Гэта гаворыць аб адсутнасьці дасканалых даных, аб моментах «оковтирательства» з боку сельсаветаў раёну.

Цікава, што калі ўпаўнаважаны ЦК УсеКП(б) праваяраў даныя аб ходзе загатовак, на сьпіцыяльна скліканай нарадзе можна было чуць чыста апартуністычныя гутаркі. Напрыклад, адзін з адказных раённых работнікаў, тав. Нядзьведзкі заявіў: «Прыдзе час—мы правым ход загатовак; зараз зьбіраем матар'ял». У РК на запытальне «як ідзе націск на кулака» — адказалі: «ого, мы здорава націснулі!»

— Дайце канкрэтныя лічбы цьвёрдых заданьняў і іх выкананьня?

— Бачыце, іх у нас няма, можна іх атрымаць у РВК.

Апошні таксама ня меў гэтых вестак, прышлося іх дабівацца ў райгандлі.

Цікава, што на 1-е сакавіка кулацка-заможныя гаспадаркі выканалі цьвёрдае заданьне на 42 проц. Такі-ж процант быў і на 5-е лютага. Адсюль відаць, што ніякага націску на кулака на працягу ўдарнага месячніка ня было зроблена.

Пры агульным выкананьні плянаў па ільнасемі калгасамі і аднаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі на 94 проц., кулакі здалі толькі 90 проц., па каноплях—67 проц., па вожжы—74 проц., па бульбе—80 проц. заданьня. Гэтыя лічбы—сьведчаць таго, як «здорава» на Клімаўшчыне націснулі на кулака.

У раде сельсаветаў наглядаюцца правапартуністычныя прымірэнчыя адносіны да кулака. У Граверыцкім сельсавеце цьвёрдыя заданьні па ільназагатоўках у 2½ тоны выкананы ў разьмеры 15-20 проц.—здана 0,2 тоны; па Пузімельскім сельсавеце замест 18 тон здана 2,2; па Сіманаўскім — 2 тоны і г. д.

Загадчык аргаддзелу райкому тав. Уласенка так тлумачыць слабы ход ільназагатовак:

— Тое, што ў нас ільназагатоўкі пад пагрозай—гэта правільна. У часе штурму нам перашкаджаў раённы зьезд саветаў (!?).

Памры Дзяніс—лепш ня скажаш.

Раённы зьезд павінен быў даць штурмшок выкананьню пляну, павінен быў мабілізаваць масы вакол загатовак. Паводле-ж апартуністычных разважаньняў, ён зрываў загатоўкі.

Райком паслаў на вёску брыгады, але яны далі вельмі нязначныя вынікі. Пасылаючы брыгады, райком ня ведаў, дзе самыя вузкія месцы.

Камсамольская арганізацыя Клімаўшчыны ня ўключылася ў штурм, яна наогул стаяла ў баку ад ільназагатовак.

Масавая работа вакол ільназагатовак не разгорнута. Рад калгасаў, замест здачы ільну, займаліся самазабесьпячаньнем. Райкалгассаюз не выдае ніякага ўліку здачы калгасамі ільнавалакна і семя.

Раённая газэта «Камуна», якая вяла ў аснoўным правільную лінію, якая своячасова сыгналізавала аб праявах права апартунізму ў некаторых раённых арганізацыях, не даволі рашуча і настойліва дабівалася ачышчэньня апарату ад апартуністычных элемэнтаў, слаба мабілізавала калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія масы на барацьбу з правым апартунізмам і прымірэнцтвам да яго.

Брыгада «Правды», «Зьвязды» і «Калгасьніка Беларусі»:
КАНТАРОВІЧ.
ФІЛІНОВІЧ
І ШКАДАРЭВІЧ.

КУЛАЦКІЯ АПЯКУНЫ—ЗА РАБОТАЙ

„ЗРАБЕЦЕ ЛАСКУ І ЗДАЙЦЕ ЛЁН"

ГАРАДОН. (Брыгада «Зьвязды»). Размер загатовак ільну за два тыдні штурму павялічыўся толькі на 6,3 проц. Крывая тэмпаў спаўзае ўніз.

У чым сакрэт ганебнага адставаньня?

Справа ў тым, што кулак, карыстаючыся «паблажкамі» з боку апартуністаў, сабатуе выкананьне цьвёрдых заданьняў. Націск на кулацкія элемэнты ня зроблен. Паводле даных райКК, кулакі выканалі 40 проц. цьвёрдага заданьня; інспэктар райгандлю ня згодзен з гэтым і называе лічбу ў 61 проц. Хто мае рацыю з іх?

Апартуністычныя памылкі старога кіраўніцтва, якія заключаліся ў дачы цьвёрдых заданьняў не па агульнай адзнаце моцнасьці гаспадарак, а тым, у каго больш засеяна. ня ўсюды выпраўлены. Ёсьць гаспадаркі, якія атрымалі цьвёрдыя заданьні на ільне і не абкладзены на бульбе і мясе.

Такая сэстэма часта закранае серадняка і дапамагае заможнікам вызваліцца ад загатовак.

Рэпрэсіўныя меры, якія ўжываюцца да нядзатчыкаў ільну па цьвёрдых заданьнях, толькі кампрамэтуюць меры адміністрацыйнага ўзьдзеяньня.

Болецкі сельсавет аштрафаваў 52 гаспадаркі па 100 руб., але не спагнаў ніводнай капейкі і нікога не перадаў суду, а лён вывозіцца на рынак. Члены прэзыдыуму Біскатоўскага сельсавету ходзяць па кватэрах і ўпрашаюць кулакоў—зрабіць «ласку» і здаць лён.

Загатоўчыя пункты ня маюць вестак аб выкананьні цьвёрдых заданьняў. Лёзунг райкому—«Пасадзіць загатоўшчыка на сані», раз пазаўсёды адмовіцца ад курсу на самацёк—не ажыцьцяўляецца. Старыя загатоўшчыкі - спэцыялісты сабатуюць гэты лёзунг, гаворачы: «мы не карабейнікі, езьдзіць па вёсках ня будзем». Між тым, практыка аднаго з загатоўшчыкаў, які разьяжджаў па вёсцы, паказала ўсю карысьць гэтага мерапрыемства. У той час, калі базы загатоўлялі на 27-30 клгр. ільнавалакна ў дзень, ён за адзін дзень загатовіў і тону. Усё-ж такі і пасьля гэтага ні райкапсаюз, ні спажывецкае таварыства ня прымусілі сваіх загатоўшчыкаў паехаць на вёску. Загатоўшчыкі сядзяць на месцы і чакаюць, пакуль лён сам прыдзе да іх.

Шмат у каго з сельсавецкіх работнікаў ёсьць праваапартуністычныя настроі, можна чуць гутаркі аб нерэальнасьці пляну, бо «быў неўраджай». Сакратар ячэйкі Кузьмінскага сельсавету тав. Дзергачоў, сакратар ячэйкі Халамёрскага сельсавету т. Максімаў (яны-ж загадчыкі базамі) заявілі, што «больш чым на адзэй тоне загатовіць нельга, бо ільну няма». Трэба адзначыць цікавы выпадак боязьні труднасьцяй і размагнэсаванасьці з боку члена райКК Нізаўцова. Ён быў высунут на пасаду загадчыка аддзелу загатовак спажывецкага таварыства. На пасяджэньні праўленьня таварыства Нізаўцоў заявіў: «я не хачу ісьці пад суд і таму не пайду працаваць у райтаварыства». Тут-жа некалькі спэцыялістаў падалі заявы аб вызьнаці з іх адказнасьці за загатоўкі, бо «калі камуніст ня хоча ісьці пад суд, дык мы і подаўна». Пастановай райКК Нізаўцоў выведзен са складу пленуму райКК.

Старшыня Канчанскага сельсавету, кандыдат партыі Сьцяпанаў заявіў: «у гэтым годзе недарод ільну, кулакі ня могуць фактычна выканаць цьвёрдых заданьняў».

Калгасы да сёнешняга дня не здалі ільну—«Чорвоны барацьбіт» ня здаў 470 клг., імя Дзяржынскага—440, імя Віцебскага гарсавету—600 клг.

Райком КП(б)Б павінен неадкладна ўзяцца за выкарчоўваньне спадчыны старога апартуністычнага кіраўніцтва.

Брыгада «Зьвязды»:
ФАРБЭРАЎ, ГАРБАЧОЎ.

3 месц сыгналізуюць

(Агляд лістоў рабселькораў)

Рабселькоры ў сваіх карэспандэнцыях аб ходзе ільназагатовак асабліва падрабязна спыняюцца на пытаньні аб выкананьні цьвёрдых заданьняў кулацкімі гаспадаркамі. Яны зусім правільна падкрэсьліваюць, што патураньня кулаком лепш за ўсё характарызуе праваапартуністычную практыку ў загатоўчай рабоце.

Тав. Бірштэйн з Заспаўскага раёну паведамляе, што Спабодзкі сельсавет, які аштрафаваў кулакоў-сабатажнікаў на 350 руб., чакае, пакуль кулакі сами прынясуць штраф і выканаюць загатоўкі. Іх ніхто на турбуе і не чапае. Дагэтуль Слабодзкі сельсавет не аддаў ніводнага кулака над суд. Старшыня сельсавету «ня бачыць» кулакоў, вярней, ня хоча іх бачыць. Лён па сельсавеце паступае вельмі дрэнна.

Селькор «Вока» са Сьмілавіцкага раёну паведамляе, што ў Абчацкім сельсавеце працуюць клясава-варожыя элемэнты, заможнікі, якія, зразумела, дапамагаюць свайму брату—кулаку. Сельсавет адстае на ўсіх відах загатовак. Па абожжы, напрыклад, плян выкананы толькі на 20 проц., па бульбе—на 20 проц., па ільне—яшчэ на меншы процант.

Таварыш С. К. у сваёй карэспандэнцыі з Сіроцінскага раёну адзначае, што кулацкія гаспадаркі сабатуюць здачу ільну, а сельсаветы зусім слаба рэагуюць на гэта. Асабліва дрэнная справа ў Казьлянскім сельсавеце.

У выніку кулак адчувае сябе вельмі добра і вязе валакно і пяньку на рынак, дзе прадае яго па спэкуляцыйных цэнах.

Тав. Чарняк, з Чэрнаўскага раёну, у сваёй заметцы спыняецца на загатоўчай рабоце мясцовага спажывецкага таварыства. Белкаапсаюз даў заданьне загатовіць 1.050 цэнт. валакна, загатоўлена—каля 150. Пянькі замест 200 цэнтн. сабрана ня больш 90. Загатоўкі ідуць самацёкам, ніякай шырокай растлумачальнай работы не праводзіцца. Загатоўшчыкі сядзяць у крамах і спакойна чакаюць, пакуль селянін сам прынясе лён.

Тав. Раскінд, з Лагойскага раёну, падкрэсьлівае, што ніякага пералому ў загатоўках няма. Дагэтуль выкананы ня больш 20 проц. заданьня. Зусім няма націску на кулацкія гаспадаркі. Ні адзін кулак ня прыцягнуты да адказнасьці за сабатаж.

Члены Паданкоўскага сельсавету хварэюць боязьню «кулацкіх сьлёз» і не прыяраюць, як кулакі выконваюць цьвёрдыя заданьні.

Супрацоўнікі спажывецкай каапэрацыі на пытаньне аб ходзе загатовак спакойна адказваюць: «цьвёрдыя заданьні даны, але яны дрэнна выконваюцца».

Паводле паведамленьня тав. Д. Кругляпова, у калтасе «Чырвоная Беларусь», Буда-Кашалёўскага раёну, ляжыць шмат неапрацаванага ільну, і райкалгассаюз ніякіх мер ня прымае.

Тав. У. Ж. у сваёй заметцы адзначае, што загадчык Дзераўноўскай крамы, Асіповіцкага раёну, Андрэй Бахір зрывае загатоўкі, бо пастаянна п'янствуе, а адатчыкі ідуць, не дачакаўшыся загадчыка.

Рашучыя меры ў адносінах да кулакоў-сабатажнікаў, паводле заметкі тав. Смугарова, прыняты ў Жлобінскім раёне, дзе загатоўкі ідуць вельмі дрэнна.

На раёне працуюць дзьве выязныя сэсіі народнага суда, якія ў тэрміновым парадку разглядаюць справы аб нядзатчыках ільну з кулацка-заможнай часткі. Гэтыя меры павінны даць дадатнія вынікі.

Тэмпы зьніжаюцца

БОРКАВІЧЫ. (Наш кар.). Плян ільназагатовак па Боркавіцкім раёне на 10-е сакавіка выкананы на валакне на 45,6%, на семі—на 47,4 проц. Вельмі дрэнна паступае ільнавалакно і семя з кулацкіх гаспадарак: замест 28,8 тон валакна паступіла 12,6, замест 28,4 тон насеньня паступіла 11,6. Гэта сьведчыць аб адсутнасьці патрэбнага націску на кулацкія гаспадаркі.

Гаварыць аб тым, што ў кулакоў няма ільну, ня прыходзіцца. Па Галубоўскім сельсавеце кулакі прадалі на рынку ў тры разы больш ільну, чым патрабавалі цьвёрдыя заданьні.

Наогул за апошні час увага да ільназагатовак значна аслабла.

Міськевіч.

Т-ва Чырвонага Крыжу—да пасеўнай кампаніі

Менскі гарадзкі камітэт т-ва Чырвонага Крыжу накіроўвае ў прыгарадныя сельсаветы на пасеўную кампанію 3 брыгады з мэдсясьцёр і актывістаў Чырвонага Крыжу — усяго 30 чалавек.

У калгасах і саўгасах будуць арганізаваны 4 пункты першай дапамогі, 2 дзіцячых ясьлі, 4 дзіцячыя пляцоўкі, зубалекавая перасоўка і пабудаваны 2 лазьні. У прыгарадным раёне будуць таксама арганізаваны кароткатэрміновыя курсы калгасьніц па аказаньні першай дапамогі на 40 чалавек і 30 чырвоных куткоў.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ, 20 САКАВІКА:

— Менгарком КП(б)Б склікае ў 1 г. 30 м. дня, у залі пасяджэньняў гаркому параду т. т., вылучаных для правядзеньня перавыбараў бюро яч. КП(б)Б і парткалектываў. На нараду павінны зьявіцца абавязкова наступныя т. т.: Дунец (рад. «Акцябр»), Будзінскі (рэд. «Зьвязда»), Роткінд (ф-ка «Акцябр»), Шулькін («Камунар»), Казлоўскі (Лесбел), Шульман (хэм. ін-т), Дзяціна («Бальшавік», Грушнеўскі («ДА»), Кумкес (ЦРК), Цімашэнка (3 кав. корпус), Левін («Камунар»), Жуковіч (ЦСПСВ), Карнечоў (чыгунка), Позьняк (Эльвод), Дварэцкі (прапасьветы), Дамброўскі (ЦП мэталістаў), Кіршэнблюм («Бальшавік»), Лібораў (Камвуз), Калабкоў (ф-ка «Акцябр»), Дзічкоўскі (гарсавет), Красіна (рад. «Рабочая»), Біго (ЦКК), Кеніг (гарКК), Карасёў («Камунар»), Суханава (ЦКК), Шчарбакоў (Камвуз), Курнік (ЦК ПК(б)Б), Кірыльчык («ДА»), Фальдман (друк. імя Сталіна), Ракаў (Саўбуд), Яноўскі (6 полк), Каранеўскі (гарсавет), Фрыдман (гарКК), Балашоў (палыў 2), Штэйман (ЦП скурнікаў), Валодзька (гарсавет), Шкірыч (гарКК), Аксючыц (Камгас), Школьнікаў (ЦРК), Шот (шклозавод), Дэйч (БДВуд), Андрэеў (Менбуд), Гусеў (Наргас), Эфрос (БДВ), Налівайка (чыгунка), Куніца (хэм. ін-т), Рыўкін (НКЮ), Плаўнік (абутк. ф-ка), Янковіч (гарком ЛКСМБ), Таўпенец (ДПУ), Грыб (міліцыя), Альтман (БДВ), Вайнаровіч («Камунарка»), Аверскі («Ударнік»), Шусэр (гарком), Вішнеўская (гарКК), Ратнэр (хэм. ін-т), Яцкоўскі (гарпракуратура), Шаўкавец (гарсавет), Мэдэшкаў (38 к. полк), Нісенбаўм (гарадраў), Гаеўскі, Плешакоў (ЦСПСВ), Лабадзеў (ЦК КП(б)Б, Фінбэйн («Энергія»), Васюковіч (ЦК КП(б)В), Хаскін («Энергія»), Танхілевіч (ЦК КП(б)Б), Кінэр, Агранёўскі (ЦК—КП(б)Б), Чахоўскі (Эльвод), Гольдбэрг («ДА»), Гурло (Наргас), Папянкоў, Платаў («Чырв. Зьмена»), Шмідт («Калгаснік Бел.), Клыс (Дзяржплян), Кіжнькаў (ЦК КП(б)Б), Каменштэйн (ЦСПСВ), Кузьнецоў (ВСМС), Ліпц (гарКК).

— Дом Камасьветы. Ад 19-21 гадз.—індывідуальная кансультацыя па гісторыі партыі і заняткі гурткa ангельскай мовы.

— Нэргас БДУ. У 19 гадз., у пам. актавай залі Унів. гар., гал. корп., адбудзецца ўрачысты выпуск студэнтаў факультэту народнай гаспадаркі БДУ.

— Мат.-Фіз. Асацыяцыя. У 19 гадз.—сход матэматычна-фізычнай асацыяцыі з дакладам тав. Усьпенскага «Хвалявыя ўласьцівасьці электрона».

— Дом Пісьменьніка. У 19 гадз.—даклад інстытуту літаратуры БАН.

— Клюб камунальнікаў. У 19 гадз.—агульны сход хатніх работніц МК № 5. Яўка абавязкова.

ЗАЎТРА, 21 САКАВІКА:

— Дом Працаўсьветы. У 19 гадз.—сход парткалектыву прапасьветы. У парадку дня—справаздача камсамольскага калектыву.

— Менгарсавет СВБ склікае на 21 сакавіка, у 19 гадз., нараду сакратароў ячэек СВБ—вытворчых, савецкіх і вайсковых, а на 22 сакавіка — школьных яч. СВБ, тэхнікумаў і ВНУ. Нарада адбудзецца ў пам. Дому Камасьветы (пакой № 18).

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Сёньня, 20-га сакавіка, у 6 гадз. веч. у памяшк. дзяржаўнага тэатру
АДБУДЗЕЦЦА
адкрыцьцё III усебеларускага зьезду калгасаў.
Уваход па мандатах і запрашальных білетах.
Пасяджэньне камуністычнай фракцыі зьезду адбудзецца ў 5 гадз. веч., у памяшк. Дому Калгасьніка (б. дом Селяніна).
Старшыня Калгаспэнтру БССР С. МІЦКОЎ.

Кіно-тэатр „Культура" — ЁСЬЦЬ, КАПІТАНІ. Звыш праг. ЗЯ УСЕНАВУЧ у 1 ч. Пачатак 7 г., 8 г. 45 м., 1 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Новы фільм У СУМЁТАХ. Звыш праграмы гукавы кіно-канцэрт. Пачат. 7 г., 8 г. 45 м., 1 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно „Кіткрасная" — БЛАКІТНЫ ПЯСАК. Звыш праграмы Політаксьветфільм Змоў з Іхтрэзнтаў. Пачатак у 6 г. Каса з 4 з-пал. гадз.

Кіно „Галчаты" — Мастацкі фільм У горад уваходзіць нельга. Пачатак 1 га сэансу ў 6 гадз.

Кіно „Юны Піянэр" — 1) МІТРОШКА САНДАТ кіно-фільм у 6 частках. 2) Пераменьне на гарыну Культурфільм у 3 частках. Пач. сэансу у 1 г. д. Каса—з 12 г. д.

Кіно „Спартак" — Ігар Ільінскі ў карціне Калі прабуджаюцца мёртвыя. намедыя ў 7 частках. Пач. у 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. Каса—з 8 гадз.

Дом Чырвонай арміі — 22 сакавіка. Для нач. складу запасу і чырвоных партызан. АДБУДЗЕЦЦА